І. В. Сталін тварэц Канстытуцыі Соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян.
Скульптура заслужанага дзеяча мастацтва, ордэнаносца З. І. Азгура. Фото І. Рабіновіча.

Янка Купала

Нашай Канстытуцыі

Мудрыя законы
Краіны Советаў
Пісаны рукою
Рабочай, мазольнай...

Нашай канстытуцыі
Слаўныя заветы
Не памруць, жыць будуць
Праўдай векапомнай.

Гэтыя законы
Ззяюць агняцветам.
Сонечна лунаюць
Зоркаю цудоўнай.

І над зарубежным
Канаючым светам,
Дзе йшчэ люд працоўны
Сёння паднявольны.

Братняй дапамогай
Роўная між роўных
БССР красуе,
Нібы жыта летам;

Скінуўшы лад царскі
І панскія прыгоны,
Сабой ганарыцца,
Як ніколі гэтак.

Увесь народ совецкі
Шуміць роем роўным
На нівах совецкіх
Квецістых, распетых...

Будуць віхры, буры,
А жыць будуць вольна
Нашай Канстытуцыі
Слаўныя заветы.

РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ. ВЫДАННЕ ЦК КП(б)Б. № 22. ЛІСТАПАД 1940 г.

ПАД СЦЯГАМ СТАЛІНСКАЙ КАНСТЫТУЦЫІ КВІТНЕЕ СОВЕЦКАЯ КРАІНА

Споўнілася чатыры годы, як лепшыя прадстаўнікі народа на VIII Надзвычайным з'ездзе Саветаў у 1936 годзе ў сталіцы нашай радзімы—Маскве зацвердзілі Сталінскую Канстытуцыю,—самую дэмакратычную Канстытуцыю ў свеце. Па праву народ назваў Канстытуцыю Сталінскай таму, што Сталін быў яе тварцом і натхніцелем перамог, запісаных у ёй залатымі літарамі.

З трыбуны з'езда вялікі правадыр народаў таварыш Сталін гаварыў:

«У рэзультаце пройдзенага шляху барацьбы і лішэнняў прыемна і радасна мець сваю Канстытуцыю, якая трактуе аб пладах нашых перамог. Прыемна і радасна ведаць, за што біліся нашы людзі і як яны дабіліся сусветна-гістарычнай перамогі. Прыемна і радасна ведаць, што кроў, багата пралітая нашымі людзьмі, не прайшла дарэмна, што яна дала свае рэзультаты».

Сталінская Канстытуцыя законадаўча замацавала перамогі соцыялізма ў нашай краіне.

З глыбокім пачуццем радасці і задавальнення жанчыны краіны соцыялізма яшчэ і яшчэ раз паўтараюць вялікія словы, запісаныя ў Сталінскай Канстытуцыі. «Жанчыне ў СССР прадастаўляюцца роўныя правы з мужчынай ва ўсіх галінах гаспадарчага, дзяржаўнага, культурнага і грамадска-палітычнага жыцця.

Магчымасць ажыццяўлення гэтых правоў жанчын забяспечваецца прадастаўленнем жанчыне роўнага з мужчынай права на працу, аплату працы, адпачынак, соцыяльнае страхаванне і асвету, дзяржаўнай аховай інтарэсаў маці і дзіцяці, прадастаўленнем жанчыне пры цяжарнасці водпускаў з захаваннем утрымання, шырокай сеткай радзільных дамоў, дзіцячых ясляў і садоў».

Гэтыя вялікія правы, заваяваныя Кастрычніцкай Соцыялістычнай рэволюцыяй, замацаваны Канстытуцыяй назаўсёды за працоўнай жанчынай. У адрозненне ад капіталістычных краін, дзе жанчына з'яўляецца рабыняй і выкарыстоўваецца, як танная рабочая сіла для эксплаатацыі на прадпрыемстве, у Совецкім Саюзе прыцягненне жанчыны для работы ў народнай гаспадарцы з'яўляецца стымулам для поўнага разняволення яе.

Мільёны працоўных совецкіх жанчын у рэзультаце Сталінскіх пяцігодак уліліся ў вялікую армію работнікаў фізічнай і разумовай працы.

У народнай гаспадарцы ў 1939 годзе працавала 10 773 тысячы жанчын, гэта значыць 34,4 процанта к агульнаму ліку працуючых.

Канстытуцыяй прадастаўляюцца вялікія правы і высока ахоўваецца чэсць кожнага грамадзяніна. На раду з гэтым Канстытуцыя ўскладае на совецкіх грамадзян адказныя і пачотныя абавязкі. Праца ў нашай краіне не толькі абавязак, але і справа гонару. Вось чаму мы павінны працаваць толькі чэсна і самаадданa, памятаючы заўсёды, што чым больш прадукцыі і лепшай якасці будуць выпускаць нашы фабрыкі і заводы, чым вышэй будзе ўраджай на калгасных і соўгасных палях, тым магутней будзе наша краіна, тым багацей і заможней будуць жыць працоўныя.

Абарона радзімы—свяшчэнны абавязак кожнага грамадзяніна. Таму доўг кожнага рабочага, работніцы, калгасніка, калгасніцы, совецкага інтэлігента выхоўваць у сабе гарачае пачуццё патрыятызма да радзімы, выхоўваць у сабе непрымірымую нянавісць да ворагаў совецкага народа і штодзённа ўмацоўваць абароназдольнасць краіны і магутнасць слаўнай Чырвонай Арміі.

Жанчыны паказваюць выдатныя ўзоры соцыялістычнай працы. Сотні тысяч з іх, штодзённа павышаючы сваю кваліфікацыю, імкнуцца стаць перадавымі людзьмі прадпрыемства. Сто тысяч жанчын працуе ў нашай краіне інжынерамі і тэхнікамі, 12,5 тысяч навуковымі работнікамі. Ці-ж гэта не радасныя лічбы?

Святкаванне чацвертай гадавіны Сталінскай Канстытуцыі супадае з гістарычнай падзеяй у жыцці народаў заходніх абласцей Украіны і Беларусі.

15 снежня гэтага года выбаршчыкі заходніх абласцей БССР і УССР пойдуць да выбарчых урнаў, каб выканаць свой грамадзянскі абавязак—выбраць дэпутатаў у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных.

Працоўныя заходніх абласцей у гэты дзень, як і ў дні папярэдніх выбараў—у Вярхоўныя Советы СССР і БССР, дакажуць сваю беззаветную адданасць вялікай партыі Леніна—Сталіна, бязмежную любоў да сваёй радзімы і роднага Сталіна і аддадуць свае галасы за непераможны блок комуністаў і беспартыйных.

У гэтым залог іх радаснага і шчаслівага жыцця, якое дала ім Совецкая улада. Чырвоная Армія на сваіх сцягах прынесла ім свабоду і вызваліла іх ад гнёта капіталістаў і памешчыкаў.

Выстаўленыя кандыдаты ў дэпутаты мясцовых Саветаў з'яўляюцца лепшымі прадстаўнікамі з народа. Вось Наварка Хрысціна—калгасніца сельгасарцелі імені Варашылава, Пінскай вобласці, Дрыжын Сара—работніца-стаханаўка запалкавай фабрыкі імені 17 верасня, Таланкіна Анна—настаўніца Варанінскай школы, Столінскага раёна, і яшчэ сотні такіх як яны. За іх—за лепшых дочак свайго народа будуць галасаваць выбаршчыкі.

Народы Совецкага Саюза адзначаюць гістарычную дату—дзень Канстытуцыі СССР 5-га снежня, як таржаство перамог соцыялізма.

У гэты дзень з асаблівым пачуццём удзячнасці думкі народа звернуты да нашай большэвіцкай партыі, да совецкага ўрада, да любімага настаўніка і правадыра таварыша Сталіна. У той час, як полымя другой імперыялістычнай вайны палыхае вакол Совецкага Саюза, народы нашай радзімы спакойна працуюць над умацаваннем несакрушальнай магутнасці краіны соцыялізма.

Пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі беларускі народ, як і ўсе працоўныя СССР, будзе і надалей павышаць прадукцыйнасць працы, выпускаць прадукцыю высокай якасці, ахоўваць соцыялістычную ўласнасць, умацоўваць працоўную дысцыпліну. Гэтым самым ён дакажа сваю любоў і адданасць большэвіцкай партыі, вялікай радзіме, правадыру народаў таварышу Сталіну.

Кандыдат СТАЛІНСКАГА БЛОКА

— Калектыў рабочых і служачых завода «Вызваленая праца»,—гаворыць работніца Карповіч,—аднадушна вылучыў кандыдатам у дэпутаты абласнога Совета дэпутатаў працоўных работніцу Екацерыну Вікенцьеўну Дульчэўскую. Яна працуе на нашым заводзе брыгадзірам. Брыгада Дульчэўскай штодзённа перавыконвае нормы выпрацоўкі і дае прадукцыю высокай якасці. Ад імені і па даручэнню калектыва рабочых і служачых завода я заклікаю ўдзельнікаў акруговай нарады прадстаўнікоў прадпрыемстваў падтрымаць кандыдатуру тав. Дульчэўскай.

Калі работніца Карповіч скончыла сваю прамову, у зале раздаліся дружныя апладысменты. Удзельнікі нарады апладыравалі кандыдату Сталінскага блока комуністаў і беспартыйных Екацерыне Вікенцьеўне Дульчэўскай, якая ў гэты час сядзела за сталом прэзідыума нарады. На вачах Дульчэўскай заіскрыліся слёзы. Гэта была невыказная радасць і гордасць за сваю радзіму, дзе працоўны чалавек мае вялікія правы, гарантаваныя Сталінскай Канстытуцыяй.

Чым заслужыла гэта звычайная і простая саракагадовая жанчына такую высокую чэсць у працоўных?

Екацерына Вікенцьеўна Дульчэўская—адна з лепшых дачок вызваленага народа. Усімі сваімі думкамі яна з працоўным народам. Сама з'яўляецца выхадцам з патомственай рабочай сям'і.

Яе бацька з малых год працаваў у Брэсце на чыгунцы. Маці была хатняй гаспадыняй. Адзіную сваю дачку Екацерыну бацькі жадалі вучыць. Яны адмаўлялі сабе ва ўсім: і ў ежы, і ў вопратцы, цешачыся надзеяй, што іх Екацерына «выйдзе ў людзі». Нялёгкая гэта была справа для бацькоў. Апошнія грашы, зароблены цяжкай непасільнай працай, яны аддавалі на вучобу дзяўчынкі.

Але надзеі бацькоў не апраўдаліся. У 1914 годзе распачалася крывавая бойня—першая імперыялістычная вайна. Многа жыхароў Брэста ў той час пайшло бежанцамі ў глыбіню Расіі. Сярод іх была і сям'я чыгуначніка Вікенція Дульчэўскага. У маладой дзяўчыны была вялікая прагнасць да ведаў, да вучобы, а скончыла яна ў той час толькі 4 класы.

— Цяжкія і суровыя былі годы,—успамінае зараз Екацерына Вікенцьеўна. Аб вучобе прышлося забыць. Я пайшла працаваць на станцыю Брэст прыбіральшчыцай. За працу плацілі мала, заработку ледзь хапала на хлеб. Так і жылі мы з маткай поўгалодныя і абшарпаныя. Жабрацкае было жыццё.

У 1921 годзе Екацерына Вікенцьеўна Дульчэўская паступіла на працу на водачны завод. Паступіць было не лёгка. Дульчэўская па нацыянальнасці беларуска, а на працу ў былой панскай Польшчы прымалі ў першую чаргу палякаў. Не мала прышлося паплакаць і перацярпець зняваг і здзекаў, каб устроіцца хаця-б чорнарабочым.

Так і працавала гэта забітая і прыгнечаная жанчына ў былой польскай дзяржаве ўсе восемнаццаць год у якасці чорнарабочага.

Вераснёўскія дні 1939 года на ўсё жыццё застануцца ў памяці Екацерыны Вікенцьеўны Дульчэўскай. Прыход Чырвонай Арміі яна сустрэла, як і ўвесь працоўны народ Заходняй Беларусі, з вялікай радасцю. Над прыгнечаным раней краем заззяла сонца Сталінскай Канстытуцыі.

З першых дзён прыхода Чырвонай Арміі работніца Дульчэўская аддаецца актыўнай грамадскай рабоце. Яна працавала агітатарам у часе выбараў у Народнае Сабранне Заходняй Беларусі, а потым з'яўлялася актыўнай удзельніцай у падрыхтоўцы да выбараў дэпутатаў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

Як толькі пачаў працаваць завод, Дульчэўская адразу прышла ў цэх. Яна энергічна, з запалам стала працаваць на сацыялістычным прадпрыемстве, працаваць ужо не на эксплаататараў, а сама на сябе, на карысць сваёй дзяржавы.

— У тыя дні я адчула сябе намнога маладзейшай, — успамінае аб першых днях работы на

Кандыдат у дэпутаты Беластоцкага абласнога Совета дэпутатаў працоўных трактарыстка Аўгустоўскай МТС тав. Е. І. Пілецкая.
Фота І. Шышко (Фотохроніка БЕЛТА).

соцыялістычным прадпрыемстве Екацерына Вікенцьеўна.—У мяне з'явіліся новыя сілы, новая энергія.

Як перадавую работніцу кіраўніцтва завода вылучыла Дульчэўскую брыгадзірам па разліўцы віна. На гэтай пасадзе Екацерына Вікенцьеўна праявіла арганізатарскія здольнасці. Праз некаторы час брыгада Дульчэўскай стала суцэльна-стаханаўскай. Брыгадзір правільна расставіла сілы, дабілася цвёрдай і свядомай дысцыпліны работніц.

Брыгада штомесячна выконвае вытворчае заданне ў сярэднім на 150 процантаў. У часе перадкастрычніцкага соцыялістычнага спаборніцтва Дульчэўская са сваёй брыгадай дабілася новай перамогі, выканаўшы кастрычніцкі план на 185 процантаў.

Звычайная і скромная жанчына, брыгадзір стаханаўскай брыгады Екацерына Вікенцьеўна Дульчэўская высока цэніць аказанае ёй давер'е і вялікую чэсць.

— Ніколі нават і не снілася,—гаворыць усхваляваная Екацерына Вікенцьеўна,—што мне акажуць такую вялікую чэсць. Я пастараюся чэсна служыць народу і апраўдаць яго давер'е.

Брэст. **А. Махнач.**

Дачка народа

У вёсцы Мойсічы і сярод акаляючых хутароў Анна Васільеўна лічылася самай багамольнай, пакорлівай жанчынай. Усе няўзгоды свайго жыцця яна бязропатна пераносіла. Думала, што ўсё гэта ад бога—«бог цярпеў і нам загадаў».

Браты Анны работалі падпольна, а яна аб гэтым спачатку і не ведала. Браты рашылі, што Анна будзе карыснай для канспіратыўнай работы. Ніхто з дэфензівы не падумае, што пакорлівая, багамольная ўдава займаецца «крамольнай справай». Пачалі рыхтаваць яе да гэтай адказнай справы.

— Цяжкае жыццё залежыць не ад бога. Бог тут ні прычым. За шчаслівае жыццё трэба змагацца самім тут, на зямлі. Слухай нас, дапамагай нам у рабоце, мы цябе не пакінем. Будзь асцярожнай, трымай язык за зубамі і калі што—будзь цвёрдай да канца: нікога ні за што не выдавай—навучалі браты Анну.

Анна пачала дапамагаць братам у канспіратыўнай рабоце. Сакрэтныя лістоўкі, цыркуляры, якія ёй прыходзілася захоўваць і перадаваць (яна і зараз мае некаторыя з іх), адкрылі ёй вочы ў новы свет, поўны радасных чаканняў лепшага, светлага жыцця. Яна з прагнасцю захапілася новай работай. Праз некаторы час сама па сабе ўжо навучылася добра чытаць і крыху пісаць. Анна аказалася здольнай падпольшчыцай. Яна выконвала самыя адказныя даручэнні і ніхто не падазраваў аб гэтым.

Але ў 1937 годзе правакатар зрабіў данос на Анну, яе арыштавалі і пасадзілі ў Маладзечанскую турму. Тры дні катавалі, прымушалі расказаць аб сваёй рабоце і выдаць саўдзельнікаў. Раздзявалі, бязлітасна білі гумавымі палкамі, абсацам у жывот. Анна цвёрда трымалася. Упала ў беспрытомнасць, але не выдала нікога.

— Калі прышла ў прытомнасць,—расказвае Анна,—то ўбачыла сябе на падлозе каменнага склепа залітай вадой. Мяне асудзілі на тры месяцы турэмнага зняволення, хаця ніякіх доказаў і не было. Пасля выхаду з турмы на працягу года я наведвала дэфензіву. У часе такіх наведванняў не раз прыставалі да мяне, прапанавалі мне грошы, каб расказала аб падпольнай рабоце. Але дарэмна, нічога ад мяне праклятыя каты не дабіліся.

У першай палове 1939 года мяне выслалі на тры годы на пасяленне ў мястэчка Шчучын-Навагрудскі. Калі пачалася германа-польская вайна мяне адправілі ў катаржную турму Бярозу Картуз. У адной камеры нас сядзела 100 жанчын. У камеры было цесна, ляжалі на падлозе, не хапала паветра, галадалі. Над намі здзекваліся, прымушалі выконваць непасільную работу, ганялі па двару, білі. Мусіць і згнілі-б за кратамі, але магутная Чырвоная Армія 18 верасня падала нам брацкую руку дапамогі—вызваліла нас з катаржнай турмы. Цяпер мы вольныя! Як радасна жыць і працаваць пры совецкай уладзе! Для мяне пачалося новае, радаснае жыццё...

Анна прыехала ў сваю вёску Мойсічы. Актыўна ўзялася за грамадскую работу. Яна засядацель народнага суда. У чырвоным кутку вёскі Мойсічы разам з селянінам Бурачонкам Сцяпанам наладзіла выданне насценнай газеты, якая выходзіць тры разы ў месяц. У вёсцы створаны пярвічныя арганізацыі МОПР'а, АСО і Чырвонага Крыжа. Анна актыўны агітатар. Пры выбарах у Народнае Сабранне была членам участковай выбарчай камісіі, а пры выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР работала намеснікам старшыні ўчастковай выбарчай камісіі.

Анна Васільеўна Валынец з'яўляецца адной з лепшых працоўных жанчын, вызваленых ад панскага гнёта. Яна сапраўдны прадстаўнік народа. Вось чаму працоўныя Хожаўскага сельсавета кандыдатам у дэпутаты абласнога совета дэпутатаў працоўных па Маладзечанскай сельскай выбарчай акрузе № 38 вылучылі Анну Васільеўну Валынец.

Ю. Снытко.

Маладзечанскі раён
Вілейскай вобласці.

На 8-м выбарчым участку г. Беластока па выбарах у мясцовыя Советы дэпутатаў працоўных. Злева направа: агітатар Ю. А. Пшэвальская з выбаршчыкамі М. Ю. Шыдлоўскай, Ю. Е. Анісевіч і Л. О. Рэпіцкім правяраюць сябе ў спісах выбаршчыкаў.
Фото А. Сапіра (Фотохроніка БЕЛТА).

Субяседванне па статуту партыі на Віцебскай акулярнай фабрыцы. Выступае стаханаўка-паяльшчыца зборачнага цэха С. Х. Славіна.
Фото М. Савіна (Фотохроніка БЕЛТА).

Вопытны машыніст

Рассякаючы сталёвымі грудзьмі паветра, міма нас праімчаўся паравоз. Прамільгнуў нумер 5357. На сталёвых баках лакаматыва ярка адсвечваліся праменні сонца. Пад'ехаўшы да пасажырскай станцыі, паравоз зменшыў хуткасць, даў тры кароткіх свісткі і, цяжка пыхкаючы, спыніўся.

З правай падножкі саскочыла бялявая дзяўчына. На ёй быў прамаслены камбінезон. Выцершы паклей рукі, яна накіравалася ў кабінет дзяжурнага па станцыі...

Зіне Мелешка ўсяго дваццаць год. Але і старыя машыністы дэпо Віцебск адносяцца да яе з вялікай павагай. Сваёй працавітасцю і крываносаўскай работай яна заваявала аўтарытэт.

Жыццё Зіны Мелешка нічым не адрозніваецца ад жыцця мільёнаў маладых патрыётак нашай цудоўнай радзімы. Нарадзіўшыся ў часы грамадзянскай вайны, ёй не прышлося адчуць і перажыць цяжару эксплаатацыі, галечы і голада.

У 1935 годзе, скончыўшы 6 класаў сярэдняй школы, 16-гадовая Зіна працавала ўжо загадчыцай малочна-таварнай фермы калгаса «Чырвоная Круччына», Сіроцінскага раёна. Часта Зіна праводзіла паязды якія праходзілі міма калгаса. Думкі яе былі там, у будцы машыніста. Мара быць машыністам не давала ёй спакою. Як зрабіць гэта, што патрэбна? Гэтых пытанняў яна не адважвалася нікому задаваць, а сама на іх не магла адказаць.

Аднойчы ў ясную зімовую раніцу 1936 года Зіна зайшла ў праўленне калгаса.

— Таварыш старшыня, адпусціце ў горад...

— Як, зусім?

— Так! Хачу стаць машыністам.

Людзі, якія сядзелі ў праўленні калгаса пераглянуліся. На іх твары можна было заўважыць насмешку і недавер'е. А дзяўчына настойвала на сваім. Яна цвёрда рашыла авалодаць гэтай прафесіяй.

Хутка Зіна ўехала ў горад. Калгаснікі давалі наказ: не асароміць сябе і калгас, даказаць сваім аднавяскоўцам чаго можа дасягнуць совецкая дзяўчына.

У той час курсаў машыністаў нідзе не было. У канторы паравознага дэпо ёй сказалі, што патрэбна пачакаць. Прышлося паступіць на фабрыку імені Кагановіча. Да канца 1937 года была чорнарабочай, потым ватэршчыцай, а ў пачатку 1938 года Зіну прызначылі брыгадзірам ватэрнай брыгады.

Актыўна ўзялася тав. Мелешка за новую работу. За кароткі перыяд яна вывела брыгаду з адстаючых у перадавыя. Увесь калектыў фабрыкі пачаў паважаць Зіну, гаварыць аб ёй, як аб лепшай стаханаўцы, якая любіць сваю справу.

Неўзабаве абвясцілі набор на курсы памочнікаў машыністаў. Зіна была бязмежна рада—нарэшце яе мара ажыццёвіцца. Аднак як-жа быць? На фабрыцы вялікі прарыў. Пакінуць фабрыку,—гэта значыць спалохацца цяжкасцей, паглыбіць прарыў. Рабочых-жа і так нехапала, а тут і яна кіне работу. І Зіна асталася працаваць у брыгадзе...

Кастрычнік 1938 года. У газеце з'явілася аб'ява аб новым наборы дзяўчат на курсы памочнікаў машыністаў.

— Цяпер і я паступлю,—цвёрда сказала Зіна падругам. А праз месяц яна ўжо лічылася слухачом курсаў. Шэсць месяцаў вучобы прайшлі непрыкметна. Здаўшы экзамен, у ліпені 1939 года яна была назначана памочнікам машыніста.

— Спачатку я не верыў у сілы і здольнасці свайго памочніка,—гаворыць машыніст тав. Пыж.—Мне здавалася, што жанчына не справіцца з такой складанай і адказнай работай.

Жыццё паказала другое: Зіна Мелешка была выдатным, здольным памочнікам. Нават у лютыя маразы мінулай зімы яна сачыла за лакаматывам, як маці за сваім дзіцём. Брыгада Пыжа выдатна працавала ўсю зіму.

У студзені гэтага года ў жыцці Зіны адбылася новая радасная падзея—яе прынялі ў члены Ленінска-Сталінскага комсамола. У гэты-ж час яна настойліва вывучала справу машыніста, а праз некаторы час, здаўшы экзамен на машыніста, сама павяла лакаматыў 22 мая ўпершыню самастойна на паравозе 5357 Зіна адправілася ў першы рэйс. У гэты дзень, як гавораць, было яе баявое «хрышчэнне». Яна стала машыністам—камандзірам лакаматыва.

Паравоз „С-У 206-72", на якім працуе памочнік машыніста комсамолка тав. Іванова Вера Георгіеўна, не ведае парушэнняў астановак. За мінулы месяц яна са сваёй брыгадай далі эканоміі паліва 10 тон.
На здымку: Тав. Іванова.
Фото І.Рабіновіча.

Зараз, машыніст Зінаіда Мелешка ў перадавых радах сацыялістычнага спаборніцтва. У жніўні і верасні яна з'эканоміла 4433 кілограммы чорнага золата—вугалю. Вераснёўскі план выканала на 109 процантаў. Паравоз падрыхтаван да зімы і яго па праву называюць комсамольскім.

Зіна Мелешка нядаўна абрана сакратаром пярвічнай комсамольскай арганізацыі цэха паравозных брыгад. Комсамольцы ганарацца сваім сакратаром. Яна трымае пяршынства ў спаборніцтве са старшым машыністам манеўровага поезда тав. Шпіно.

А. І. Касцяноўскі.

Віцебск.

ДЗВЕ ПРАФЕСІІ

На двары толькі што адбудаванай МТС пыхцелі трактары. Сюды прышла Паша Кавалёва падаць заяву аб залічэнні яе на курсы трактарыстак. Просьба яе была задаволена.

Ранняй вясной, калі падсохла зямля, Паша ўпершыню выехала на трактары. Сэрца напоўнілася радасцю. Цяпер яна не будзе адставаць ад падругі—студэнткі Вары, якая хутка стане медыцынскай сястрой, ад свайго брата Макара, які набыў прафесію шофера. Яна таксама набыла добрую прафесію.

Цяжкія лемехі трактара прагна ўпіваліся ў тлустую глебу. Зямля пераварачвалася шырокімі скібамі. За змену трактарыстка ўзарала 6 гектараў, з'эканоміла 25 кілограмаў гаручага. Гэта вельмі абрадавала Дзімітрыя Прыгіна, з якім яна працавала напарнікам. А калі Паша стала ўзорваць за змену па 8 і больш гектараў, трактарыст зажурыўся—дзяўчына аперадзіла яго ў рабоце. Чаго засумаваў Дзімітрый—Паша здагадалася. Яна рашыла дапамагчы хлопцу.

Прыклад Пашы да таго ўздзейнічаў на Дзімітрыя, што ён таксама пачаў перавыконваць нормы. У канцы сезона ён нават узараў крыху больш за Пашу. І калі брыгадзір запытаў яго пра справы, ён адказаў не без іроніі:

— План мы выканалі, але можна было-б даць і больш. Толькі вось, бачыш, дзяўчына напарнікам...

Такой абразы ад Дзімітрыя Паша не чакала. Яна ў свой час скрыла яго адставанне ў працы ад брыгады, працавала больш, каб пазбавіць яго ад непрыемнасці, а ён? Ён вось як аддзякаваў за гэта.

— Дык што-ж, Міця,—з жалем прагаварыла Паша.—Выходзіць, што я горш за цябе працавала.—Яе голас уздрыгнуў:—Пачакай браток, прыдзе другі сезон, я табе дакажу, што значыць дзяўчына-трактарыстка, ды яшчэ комсамолка.

Аднойчы дзяўчаты-трактарысткі сабраліся ў машына-трактарнай станцыі. Пайшлі задушэўныя гутаркі. Паша расказала пра выпадак з Дзімітрыем. Амаль у кожнай трактарысткі былі падобныя скаргі. Дзяўчаты

Маладыя калгасніцы сельскагаспадарчай арцелі імені Молатава (Несвіжскі раён, Баранавіцкая вобласць)—былыя батракі Радзівіла Софія Шапавал (злева) і Ольга Копытко за 5 месяцаў выпрацавалі ў калгасе 430 працадзён. На свае працадні яны атрымалі авансам 3435 кілограмаў зернавых і 10320 кілограмаў бульбы.

Фото В. Лупейка (ФотохронікаБЕЛТА).

працуюць, стараюцца, а некаторыя хлопцы недаацэньваюць іх работу. Стаў трактар. Вінават хто?—дзяўчына. Не выпрацаваў нормы трактарыст, зноў заяўляе,—дзяўчына ў мяне напарнікам.

Трактарысткі парашылі арганізавацца ў жаночую комсамольска-маладзёжную брыгаду. Дырэкцыя гэтаму пайшла насустрач.

Калі такая брыгада была створана, дзяўчаты яшчэ дружней прыняліся за работу. Усе замацаваныя за імі трактары ўзорна адрамантавалі.

Вясной у брыгаду ўліліся новыя трактарысткі з курсаў. Выехалі на поле. Брыгада выйшла ў перадавыя па МТС і свайго пяршынства не здавала праз усё лета. Кожны трактар датэрмінова выканаў гадавыя заданні. Работа была выключна добраякаснай.

Паша заўсёды была перадавіком у працы: трактарам ХТЗ узорвала за сезон па 450—485 гектараў, эканоміла па 1.000 кілограмаў гаручага. Але сваёй работай яна была незадаволена. Працаваць-жа прыходзілася толькі вясной і восенню, летам трактар стаяў. І Паша ва што-б там ні стала рашыла набыць новую прафесію,—стаць камбайнеркай.

Выпраўляць яе на курсы прышла ўся брыгада.

— Глядзі-ж, даражэнькая, не падкачай на вучобе,—давалі наказ дзяўчаты.

— А вы трактары найлепш даглядайце, я-ж і на іх працаваць буду.

Зноў вучоба, зноў механізмы, чарцяжы, лекцыі. Камбайн «Комунар» значна больш складаная за трактар машына, Паша і яго добра вывучыла.

Родная вёска сустрэла камбайнерку распрасцёртымі нівамі, даспелым каласістым жытам, шумлівымі ячменямі, буйнай залацістай пшаніцай. За штурвал магутнага агрэгата Паша стала з вялікай гордасцю. Яна павяла камбайн плаўна і роўна. Паша ўбрала 250 гектараў. А скончылася ўборка, трэба было падымаць зяб—і яна села на трактар. Выпрацавала за сезон 489 гектараў. Сёлета-ж яна дабілася рэкорднай у МТС выпрацоўкі 693 гектараў трактарам і камбайнам.

Па прыкладу Пашы авалодалі новымі прафесіямі ўсе дзяўчаты з брыгады. Трактарыстка Маруся Пасялентава стала машыністам малатарні. Другая—трактарыстка-комсамолка Марыя Рыжанкова—памочнікам камбайнера, Соня Арцёменка была плугаром, а цяпер трактарыстка. Дзяўчаты ірвуцца да вучобы, да ведаў.

А. Бузо.

Магілёўская вобласць,
Прапойская МТС.

Всеволод Вишневский

Мы помним...

Мы направлялись ко дворцу Урицкого. Таврический сад шумел. Черные огромные деревья сгибались под ветром. Я остановился—узнал дерево на углу у решетки. Здесь зимой 1917—1918 года стоял наш пост. Дерево несколько изменилось. Я находу тронул, погладил его кору. У входа во дворец что-то сказали. В эту минуту разом все почувствовали, что что-то случилось, изменилось. В толпе движение. «Ранен Киров»...

Много раз я видел родной город в большие, суровые дни. У него свой облик, свои традиции.

Ранили Кирова!—Едва уловимые перемены произошли в глазах, в лицах людей. В них явственно проступили все черты настороженности бойцов под огнем.

... «Ему дают кислород...»—Коммунисты Ленинграда стояли, вслушиваясь и продумывая вновь—все с самого начала. Не было суеты. Это были мгновенно мобилизовавшие себя люди особой породы, особой организации. Свидетельствуют, что многие думали: Киров выйдет на партактив и раненый... Ленин также держался. Нас охватил какой-то внутренний трепет. В душе все сжималось от наплыва чувств и мыслей. Стреляют?!—Все люди и дела большевизма разом заполнили душу и сознание. Людей и дел было так много, и они были такие опаляюще-горячие и огромные, что внутри, в сердце, било через край. Было видно, как бледнели лица, расширялись глаза. Это была боеготовность и беспощадность.

Все это вихрем взвилось в несколько секунд ожидания. Коммунисты города пришли на актив. Дисциплина не позволяла отойти, смешаться... «Партактива не будет, товарищи»...

Все насторожились. «Киров умер»...

Из глаз некоторых товарищей побежали слезы... Да что же это, Сергей Миронович?—Вот он с нами на фронте,—крепкий, шутит и делает дело, упорный военачальник, проницательный победитель. А теперь в Смольном—вот тут, в двух шагах,—лежит мертвый, лицо обескровленное?..

Сергей Міронавіч Кіраў на трыбуне плошчы Урыцкага (1 мая 1933 года)

Фото Е. Велічко.

Разом во всем могущественном собрании вспыхнули две мысли, два вопроса: Кто убил? Чем ответим? Мысль, воля, действие. Все соединено в большевиках воедино. Никто еще не знал: кто убил. Но вот точно,—что записал я в тот час... «Стоим, думаем, спрашиваем: кто? Ясно—террор. «Так» этого не бывает. Кто подослал? Воспоминания о белом терроре 1918 года... Ну, подождите!..»

С сумрачным огнем люди—без зова, без директив—по классовому велению, безошибочному,—рынулись на заводы, в части, на корабли... Великий Ленинград начал мобилизацию. Люди не «торопились», а двигались, как в начале огромной операции. Ее замысел был прям, грозен и до конца вырешен тут же: из'ять и уничтожить предателей и убийц. Так мы делали раньше, так будем делать ныне и впредь.

От редакций уходили машины одна за другой. На заводы, к истокам сил! В пальто, не снимая фуражек, в кабинеты заходили рабкоры. Все стали как-то ближе друг к другу, проще и лучше. Никто не знал еще подробностей. Не сговариваясь, — общее мнение: «агентура; убийца связан должно быть, с заграницей...» Это вытекало из логики борьбы. Кто от нас отходит, тот прямо попадает туда: к черным врагам.

Московско-Нарвский район. Вот тут стояли проволочные заграждения осенью 1919 года.—Завод... «Электросила». «Товарищи, в Смольном убит Киров». Пристальные, испытующие взгляды... Секретарь парткома, усталый, сжимает полуподнятую руку.

Начальник заводской охраны, усатый старичок, в шинели, с револьвером, говорит: «Два ока за око! Вы это не забывайте».

Через несколько дней пролетариат узнал: убийца—из зиновьевско-троцкистской организации. Так. Дошли мерзавцы «последовательно». Мешали и предавали с 1905 года; одобряли войну; в 1917-м толкали Ленина на суд Временного правительства. Спас Ленина Сталин—настоял на уходе в

подполье. Иуды искали других путей, выдавали план Октябрьского восстания; сговаривались с эсерами и меньшевиками о «коалиционном правительстве», бастовали, подличали, подстраивали поражения, «дискуссии», демонстрации. Теперь—выстрелили из-за угла. Ответ народа: пойдете в могилу.

Рассвет 2-го декабря. У типографии сырые серо-защитные грузовики. Газету ждут всю ночь. Ждут утра... Набор шел с запозданием: ждали информацию из Москвы. Газеты появились на улицах в 2 часа дня. У Октябрьского вокзала толпа. Газету, прибитую, как во время гражданской войны, к стене, читают вслух. Нашу партию постигло большое несчастье...

Неровным голосом читает товарищ строки, писанные, как чувствуют все, рукой Сталина: «До последних дней своей жизни и борьбы мы будем вспоминать тебя, дорогой друг, и будем чувствовать горечь нашей утери. Ты был всегда с нами в годы тяжких боев за торжество социализма в нашей стране, ты был с нами всегда в годы колебаний и трудностей внутри нашей партии, ты пережил с нами все трудности последних лет, и мы потеряли тебя в момент, когда наша страна достигла великих побед... Прощай, наш дорогой друг и товарищ Сергей!..»

Телеграф несет к Ленинграду тысячи обращений—со всех сторон земли.

К пяти часам народ, отработав до гвоздика свои нормы, хлынул к гробу Сергея Мироновича во дворец Урицкого. Много видел этот дворец... Он не видал никогда такого трагического величия и скорби.

Старики, былые питерские мастеровые, пишут Сталину, и в слезах, упавших на письмо, расплываются буквы: «Мы хорошо понимаем, как тебе тяжело в эти дни...»

А в ушах слова убитого, прозвеневшие на всю страну в с'ездовские дни января 1934 года: «Чорт его знает, если по-человечески сказать, так хочется жить и жить,—на самом деле, посмотрите, что делается!»... И с'езд и страна видели обаятельную мужественную улыбку человека-героя.

Пионеры,—дети, впервые в жизни видящие смерть,—молча, с раскрытыми глазами глядят на лицо убитого. «Папа, за что его убили?..»—«Трудно тут рассказывать, сынок мой... За то, что он сказал и делом закрепил: «Товарищи, много веков тому назад великий математик мечтал найти точку опоры, для того, чтобы, опираясь на нее, повернуть земной шар. Прошли века, и эта опора не только найдена, но создана нашими руками. Не пройдет много лет, когда мы с вами, опираясь на завоевания социализма в нашей Советской стране, оба земных полушария повернем на путь коммунизма».—«Кто его убил, папа?»—Его убили злодеи-убийцы.

Город прощался со своим верным Кировым. Люди шли всю ночь и потом весь день 3 декабря. В 4 часа 30 минут к гробу подошел Сталин.

Гудки Ленинграда заревели человечески-тоскливо... Сталин долго смотрел в лицо убитого. Гроб подняли... Траурный поезд двинулся в Москву.

Москва приняла тело убитого друга и героя. По снегу, в тишине, мерно, с непокрытыми головами, в глубоких раздумьях идут за гробом народ и вожди.

Семь знамен было над гробом. Два ордена лежали на бархате... Зима, народ и события вошли в Колонный зал. Паркет весь в следах: это Москва, Россия и шестьдесят народов Союза походом идут мимо гроба, прощаясь,—идут, приняв свои решения, не подлежащие изменениям.

Рассветает... 6 декабря. Страна хоронит одного из военачальников, мыслителей, организаторов...

... Мороз и багровое солнце над Кремлем и Красной площадью. Оно тускло светит в ледяном тумане. Войска протаптывают темные дорожки на снегу. Не спускающийся, навечно поднятый красный флаг над ЦИК. Ленин, Сен-Катаяма, Дзержинский, Фрунзе, Клара Цеткин... Залпы ударяют в небо. Миллион двести тысяч человек начали марш мимо могилы героя.

* * *

«Не теряться перед утратами», «смело, с высоко поднятой головой итти вперед»...—призывал Киров. Это—правило, привычка народа-большевика. И он шел вперед. Труд изменял в стране природу и людей. Поворачивали Волгу. Строили порты в Арктике. Пробивались сквозь хребты и тайгу,—думая перед Комсомольском: поезд пойдет, должен пойти и до Камчатки. Так хотим, так сделаем... Опережали Европу в индустриальных показателях. Люди являли поразительные примеры чистоты, прямоты, непоколебимости, волевой твердости.—И на это ни с чем несравнимое до сих исторических пор движение подняли свои грязные руки троцкистские убийцы и отравители, агенты фашизма и предателей. Их взяли с поличным. Их рожи перекосились от страха...—От взятых отобрали оружие с фашистскими клеймами. Все было ясно. Приговор был короток. Мы помним Кирова. До конца дней своих. Мы идем вперед под знаменем Ленина—Сталина.

Из книги „Киров в художественной литературе".

Кіраў. Скульптура работы Віленскага.

Любімы паэт беларускага народа

(Да 35-годдзя літаратурнай і грамадскай дзейнасці Янкі Купалы)

Больш 30 год таму назад вялікі паэт беларускага народа Янка Купала пісаў:

Я не паэта, о крый мяне божа!
Не рвуся я к славе гэткай ні мала.
Хоць песеньку-думку і высную можа,
Завуся я толькі—Янка Купала.

Кожны край мае тых, што апяваюць,
Чым ёсць для народа ўпадак і хвала,
А беларусы пікога-ж не маюць,
Няхай-жа хоць будзе Янка Купала.

Так, тады над краінай панаваў жах царскай рэакцыі і беларусы не мелі нават паэта. Гэта быў закінуты і замучаны край.

Янка Купала (нарадзіўся ў 1882 годзе) ўжо з першых дзён сваёй творчасці з'яўляўся паэтам народа. Выступіўшы на літаратурную арэну 35 год таму назад (у 1905 годзе) Купала адразу заявіў, што выступае ад імені беларускага мужыка-селяніна. Не дарма першы верш Янкі Купалы называўся «Мужык». У ім ён пісаў:

І кожны, хто мяне спытае,
Пачуе толькі адзін крык:
Што хоць мной кожны пагарджае,
Я буду жыць, бо я мужык!

Янка Купала выступіў у літаратуры, як прадстаўнік рэвалюцыйна-дэмакратычных мас сялянства.

Ён быў узняты на хвалях дэмакратычнай рэволюцыі 1905 года і высунуў у сваёй творчасці тыя патрабаванні, якія высоўвала рэволюцыйнае сялянства. Купала патрабаваў зямлі і волі для прыгнечаных сялянскіх мас.

Беларусь пры царызме была прыгнечана не толькі сацыяльна, але і нацыянальна. І натуральна, што Янка Купала побач з сацыяльнымі патрабаваннямі высоўвае патрабаванні нацыянальнай самастойнасці для беларусаў, права развіцця літаратуры, культуры, школ, мовы.

Янка Купала ў годы 1905—1908 заклікае беларускае сялянства паўстаць супроць цара і памешчыкаў, якія смакталі кроў з сялянскіх жыл.

Купала піша ў гэтыя годы вершы—пракламацыі, разлічаныя на аратарскі голас і напісаныя ў аратарска-заклікальным тоне:

Хай кроў пальецца дзень-другі
Варожым трупам на падсцілі,
Хай у няволі ланцугі
Спадуць ад грому вашых сіл.

Тэматычна Янка Купала ў гэтыя годы непарыўна звязан з вёскай. Пераважнымі тэмамі яго вершаў, з'яўляюцца голад вясною, цяжар падаткаў, сялянская цемра і іншае.

Апрача палітычнай лірыкі—у годы 1913—1916 Янка Купала стварае і больш шырокія палотны. Купала піша паэму «Курган», «Бандароўна».

«Курган» паэма пра князя, які хацеў за грошы купіць народнага гусляра. Але гусляр пайшоў на смерць, а не схлусіў у сваіх песнях. Вобраз стогадовага гусляра, сівога, мужнага напісан Купалам у яркіх фарбах.

Купала бліскуча скарыстаў народную легенду пра Бандароўну». На тэму гэтай легенды ён напісаў паэму, накіраваную супроць польскіх паноў. Пан Патоцкі прапануе маладой прыгожай сялянскай дзяўчыне золата і шаўкі, каб яна з ім «ночкі—каратала». Але Бандароўна выбрала лепш смерць, чым прадаць свой гонар. Купала разгарнуў матыў абурэння, які ёсць у народнай песні, да паказа ў паэме паўстання украінскага народа супроць магнатаў:

Весць аб смерці Бандароўны
Скрозь пашла, як мора,
Зашумела Украіна—
Гора панам, гора!
Бандарэнка сходы кліча,
Усім аб крыўдзе кажа;
Войска сільнае збірае,
Роўна сіле ўражай.

Першым з рускіх пісьменнікаў, які заўважыў Купалу быў А. М. Горкі. Яшчэ ў 1911 годзе ён пісаў пра беларускую літаратуру:

«Я звяртаю ўвагу скептыкаў на маладую літаратуру беларусаў, самага забітага народа ў Расіі... Дазваляю сабе падаць песню, выданую нядаўна «Нашай Нівай». Словы напісаны беларускім паэтам Янкам Купалам:

А хто там ідзе, а хто там ідзе
У агромністай такой грамадзе?
— Беларусы.
А што яны нясуць на худых плячах,
На руках у крыві, на нагах у лапцях?
— Сваю крыўду.
А чаго-ж, чаго захацелась ім,
Пагарджаным век, ім, сляпым, глухім?
— Людзьмі звацца.

У гэтым вершы, які Горкі назваў «Красамоўнай і суровай песняй» нацыянальна-вызваленчыя патрабаванні Янкі Купалы, выказаны з вялікай сілай. У вершы, якому Аляксей Максімавіч прарочыў зрабіцца на час «гімнам беларускага народа», паказаны забітасць і прыніжанасць шматмільённага народа.

У пісьме да Кацюбінскага Горкі зноў варочаецца да цудоўнага твора Янкі Купалы. Ён піша, што яго «гэта рэч усхвалявала»... Памятаеце вялікарускую песню «Мы не сами то идем, нас нужда ведет, нужда горькая».

Народны паэт БССР Янка Купала.

Адзначаючы выдатныя якасці двух тады маладых беларускіх паэтаў Янкі Купалы і Якуба Коласа Горкі падкрэсліваў, што яны: «проста пішуць, так ласкава, журботна, шчыра».

Гэта высокая ацэнка творчасці Купалы паказвае прадбачлівасць вялікага пролетарскага пісьменніка, які ўжо тады разгадаў сілу гэтага майстра беларускай літаратуры.

Нельга не адзначыць, што на творчасць Купалы моцны ўплыў зрабіў вялікі рускі паэт Пушкін, у асаблівасці Некрасаў і Шэўчэнка. Іменна, наследуючы Некрасава і Шэўчэнка, складаў свае ранніе горкія песні наш народны паэт.

Творчасць Янкі Купалы грунтуецца на народнай паэзіі. Да рэволюцыі яна, як мы бачылі, апявала нядолю беларускага народа, выражала яго гнеў і нянавісць супроць тыраніі царызма і паноў.

У дні соцыялістычнага будаўніцтва Купала назаўсёды звязвае свой лёс з лёсам сваёй радзімы. Купала пачынае ўважліва і дапытліва прыглядацца да новага жыцця, да новых людзей, да совецкай моладзі і стварае рад надзвычайных вершаў і песень пра совецкую рэчаіснасць.

Тут трэба назваць лепшыя вершы Купалы совецкага перыяду, якія зрабілі яго імя папулярнейшым у нашым народзе. Гэта—«Дзве сястры», «Арлянятам», «Сыходзіш, вёска, з яснай явы», «Дыктатура працы»,«Выпраўляла маці сына» «Сыны» «Як у госці сын прыехаў» «Хлопчык і лётчык», «Лён», «Госці», паэма «Над ракой Арэсай» і вялікі верш «Табе, правадыр».

Сіла лірыкі Янкі Купалы ў яе вялікай шчырасці, праўдзівасці, у тым, што Купала выказвае ў ёй не толькі свае пачуцці, але і пачуцці народа, у тым, што ён чутка падслухаў і трапна выказаў настроі патрыётаў сваёй радзімы. Вершы Купалы натхнёны пачуццямі, якімі жыве народ. Купала выражае яго радасць і гора, яго ўздым і гатоўнасць абараняць радзіму. Сіла паслярэволюцыйнай лірыкі Янкі Купалы ў глыбокай прастаце яго твораў, у народнасці мовы, у песеннасці.

У вершы «Сыны», як у народным эпасе, кліча бацька сыноў да сябе і пытаецца кім яны быць хочуць, з чым у свет выйдуць. І вось адзін з іх жадае зямлі, трактарам варочаць, другі—плавіць чыгун, трэці—вадзіць караблі, чацверты—лётаць на самалёце, пяты—быць чырвонаармейцам, і нарэшце шосты—паэтам. Перад усімі імі ў совецкай краіне адкрыты арліныя гарызонты і самі яны арляняты.

Вялікую колькасць твораў, прысвечаных совецкай жанчыне, напісаў Янка Купала.

Пачынаючы з верша «Дзве сястры», дзе паэт выражае ідэю еднасці работніцы і сялянкі, Янка Купала ўсё больш і больш паглыбляе і пашырае гэтую тэму.

У вершах «Песня трактарысткі», «Дзве дзяўчыны», «Для тых, якіх люблю», «Я—калгасніца» паўстае перад намі воблік шчаслівай жанчыны, якая пазбылася былое нядолі і гора. Асабліва ярка паказвае ў сваіх творах Купала вобраз жанчыны калгаснай вёскі. Вось перад намі маладая шчаслівая калгасніца. У народнай, спакойнай, пераканаўчай інтанацыі верша мы адчуваем вялікія багацці ў калгасе, спакой калгасніцы за будучыню сваю і дзяцей:

Я—калгасніца
Маладая,
Жыву весела,
Ані дбаю.
Мае дзетачкі
Позна-рана
І накормлены
І прыбраны.

У вершы «Алеся» Купала выказаў задушэўныя думы нашага народа, яго мары і жаданні. Маці да рэволюцыі ў калыханцы прарочыла батрацкую долю сваёй дачцы Алесі, але не ўгадала яе будучыні. Яе дачка пры совецкай уладзе кіруе самалётам. Напісаная ў фальклорных тонах гэта песня стала любімай песняй народных мас Беларусі.

Ці-ж не падобны лёс Валенціны Грызадубавай і дачкі беларускага народа Веры Ламака да лёсу Алесі?

У вершы «Табе правадыр» Янка Купала звяртаецца да вялікага правадыра народаў таварыша Сталіна з удзячнасцю за радаснае—светлае жыццё, данае беларускаму народу вялікім Сталіным.

Значэнне Янкі Купалы, як паэта, не толькі для беларускай совецкай літаратуры, але і для ўсёй літаратуры Совецкага Саюза,—вялікае. Ён з'яўляецца класікам беларускай літаратуры, ён працягвае цудоўныя традыцыі Некрасава і Шэўчэнкі, яго народныя вершы і песні любоўна паўтараюцца і спяваюцца ва ўсіх рэспубліках Совецкага Саюза.

Вялікая партыя Леніна—Сталіна дала магчымасць народу Совецкай Беларусі пабудаваць радаснае шчаслівае жыццё. Вялікі песняр нашага народа Янка Купала знаходзіцца на вяршыні сваёй песнярскай славы. Акружаны ўсенароднай павагай, узнагароджаны вышэйшай у СССР узнагародай—ордэнам Леніна, ён з'яўляецца цяпер паэтам не толькі беларускага народа, але і ўсіх народаў Совецкага Саюза.

35 гадавіна творчай дзейнасці застае паэта ў поўным росквіце творчых сіл. І Купала дасць яшчэ совецкаму народу не адзін цудоўны твор аб нашым гераічным часе, аб нашых велічных справах. Зарукай гэтаму велізарная любоў яго да народных мас Совецкага Саюза, якія пад кіраўніцтвам мудрага Сталіна ідуць да вяршынь чалавечага шчасця—да комунізма.

А. Кучар.

За што я люблю творчасць Купалы

Выдатны беларускі пісьменнік Янка Купала ўнёс шмат каштоўнага і карыснага не толькі ў беларускую літаратуру, яго творы—каштоўны ўклад ва ўсю совецкую літаратуру. Першы крок у літаратуру Купала зрабіў у самы разгар рэволюцыйнага ўздыму, у той час, калі рабочы клас пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі вёў барацьбу супроць самадзяржаўя, супроць прыгнятальнікаў, за сваё вызваленне.

Я, як літаратар, з вялікім натхненнем чытаю ў школе лекцыі аб творчасці Купалы. Мне спадабаецца творчасць Купалы за тое, што ён у сваіх дарэволюцыйных творах вельмі праўдзіва апісаў жыццё і быт прыгнечанага сялянства, іх нянавісць да паноў, чыноўнікаў і цара. У зборніку «Жалейка» вершы яго выражаюць мары і жаданні працоўнага сялянства вызваліцца з-пад гнёту самадзяржаўя, жаданне будаваць шчаслівае жыццё.

Часта пры праходжанні дарэволюцыйнай літаратуры я ўжываю вытрымкі, цытаты з вершаў Купалы. Вучні таксама любяць яго творчасць Яны завучваюць яго вершы напамяць, перачытваюць па некалькі разоў.

У гутарцы са мною яны падзяліліся сваімі ўражаннямі.

— Мы любім творчасць пісьменніка-ордэнаносца за тое, што, чытаючы яго творы, мы многа аб чым даведаліся з мінулага жыцця працоўнага сялянства, пра той гнёт народных мас, пра тую барацьбу, якую вялі народныя масы за сваё вызваленне.

Цяпер мы вывучаем твор «Над ракой Арэсай». З гэтага твора вучні даведаліся аб велізарнай рэканструкцыі Палесся, аб будаўніцтве калгасаў, соўгасаў на былых Палескіх балотах.

Я стараюся на такіх праўдзіва напісаных прыкладах прывіць вучням любоў да літаратуры, любоў да радзімы.

Сама я люблю творы Купалы, дзе апяваецца радасць нашага жыцця, героіка рэволюцыйных будняў, гэта творы: «Сыны», «Як у госці сын прыехаў», «Дзве сястры», «Выпраўляла маці сына». Усе яны маюць рознастайную і багатую тэматыку, напісаны сакавітаю, зразумелай і даступнай для кожнага чытача мовай.

За 35 год сваёй літаратурнай дзейнасці Янка Купала напісаў многа твораў. Чытаеш іх і перад табой паўстае цёмнае мінулае Беларусі і радаснае сучаснае. Творы яго захапляюць чытача зразумелай, багатай мастацкімі прыёмамі мовай.

Адзначаючы 35-годдзе літаратурнай дзейнасці Янкі Купалы, жадаю яму доўгіх, доўгіх год творчай работы на карысць совецкай літаратуры, на карысць совецкага народа, на карысць партыі Леніна—Сталіна.

Настаўніца З. Масалкова.

Талачын.

Школьнікі заходніх абласцей Беларусі праяўляюць вялікі інтарэс да новай для іх совецкай літаратуры.
На здымку. Вучні сярэдняй польскай школы № 1 г. Аўгустова ў школьнай бібліятэцы за падборам літаратуры.
Фота А. Сапіра (Фотохроніка БЕЛТА).

Вывучаю гісторыю партыі

Настаўнікам даверана выхоўваць маладое падрастаючае пакаленне. Каб справіцца з гэтай задачай, яны павінны ведаць вельмі многа. Яны павінны ведаць самыя разнастайныя навукі, і ў першую чаргу марксісцка-ленінскую навуку аб грамадстве.

Вывучэнне «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» я скончыла ў ліпені 1939 года. Асноўны мой метад авалодання марксізмам-ленінізмам—самастойнае вывучэнне «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» і твораў Маркса, Леніна, Сталіна. Мною было праслухана многа лекцый па радыё, якія перадаваліся ў дапамогу вывучаючым гісторыю нашай партыі.

Акрамя таго выкарыстоўвала артыкулы, змешчаныя ў журнале «Большевик» і ў газетах. Слухала даклады, арганізаваныя партыйным кабінетам.

Вывучыла ўжо кнігі Леніна «Что делать?», «Шаг вперед, два шага назад», «Две тактики социал-демократии в демократической революции» і другія.

У сучасны момант я працую над кнігай В. І. Леніна «Материализм и эмпириокритицизм». Слухаю даклады па радыё, наведваю лекцыі, арганізаваныя ў дапамогу вывучаючым гісторыю партыі.

Кожны член нашага грамадства павінен авалодаць асновамі марксізма-ленінізма, самастойна, упарта працуючы над сабой.

Ульчонак Екацерына Сяргееўна, настаўніца.

Талачын.

ПЛАДЫ СТАХАНАЎСКАЙ ВУЧОБЫ

Другі год працуе стаханаўская школа пры Дрысенскім дзяржаўным сортадаследчым участку. Аграномы ўчастка ў зімовы і веснавы перыяд практычна вывучылі вопыт работы ўдзельнікаў Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. Дапамаглі складаць агрmaпланы, асвайваць севазвароты, рэнтабельна выкарыстоўваць мясцовыя і мінеральныя ўгнаенні.

Па ўчастку было праведзена звыш 29 гутарак на розныя агранамічныя тэмы. Зроблена каля 34 выездаў у калгасы, з разлікам на месцы аказаць дапамогу звеннявым, брыгадзірам і старшыням калгасаў. У рэзультаце практычнай вучобы мы дабіліся таго, што ў нашым раёне вырошчваюцца новыя культуры, як, напрыклад, грэчка, проса, галазёрны ячмень, кармавыя травы—пейзы, магары, бора, хмелевідная люцэрна, сорга і іншыя.

Дзякуючы вучобе ў стахакаўскай школе пры нашым сортадаследчым участку многія звеннявыя, брыгадзіры, старшыні калгасаў дабіліся выдатнага ўраджаю на сваіх палях. Калгас «Другая пяцігодка» зняў у гэтым годзе па 17 цэнтнераў грэчкі з гектара, каля 20 цэнтнераў проса з гектара. Таксама высокі ўраджай атрымалі і гародніны. Капусты знята з гектара каля 400 цэнтнераў, буракоў—375 цэнтнераў з гектара, цыбулі—каля 350 цэнтнераў з гектара. У першай брыгадзе гэтага калгаса з усёй плошчы знялі ўраджай зернавых культур па 100 пудоў з кожнага гектара.

У калгасе «Ударнік» вывучалі агратэхніку ўсе брыгадзіры, звеннявыя, стаханаўцы. Яны займаліся ў стаханаўскай школе. Набыўшы веды па агратэхніцы і маючы багаты вопыт у рабоце звеннявыя Марыя Ляхоўская, Беленькевіч і другія атрымалі з участка ў 3 гектары па 180 пудоў ячменю з кожнага гектара, з 10 гектараў аўса—па 120 пудоў з гектара, азімага жыта з плошчы 33 гектары—па 102 пуды з гектара. Па ўсяму калгасу ў сярэднім атрымалі сёлета 114 пудоў з кожнага гектара.

Таксама добра была наладжана вучоба ў калгасе імені Леніна, Жоўненскага сельсовета, у калгасе імені Калініна.

Пры сельскагаспадарчай арцелі імені 17 верасня (Несвіжскі раён, Баранавіцкая абласць) арганізавана вячэрняя агульнаадукацыйная школа. 65 калгаснікаў і аднаасобнікаў павышаюць у ёй агульнаадукацыйны ўзровень.
На здымку: на ўроку Сталінскай Канстытуцыі.
Фото В. Лупейко (Фотохроніка БЕЛТА).

— Вучоба ў стаханаўскай школе, — гаворыць звеннявая калгаса імені Калініна тав. Савіцкая,—дала мне многа для забеспячэння высокага ўраджаю. Я дабілася атрымання па 105 пудоў яравой пшаніцы з гектара.

Пры стаханаўскай школе ёсць добра абсталяваны агракабінет, адпаведная сельскагаспадарчая літаратура, наглядныя дапаможнікі. Аграномы Дрысенскага сортадаследчага ўчастка зараз працуюць над тым, як атрымаць два ўраджаі за год ва ўмовах нашага раёна.

Аграном **І. Агнёў.**

АЎТАРЫТЭТ, ЗАВАЯВАНЫ СПРАВАЙ

Анна Казіміраўна Гарбачэнка па спецыяльнасці акушэрка. Вось ужо 14 год працуе ў Дрысенскім радзільным доме. Вытворчы стаж яе на гэтай пачотнай прафесіі раўняецца 35 годам. За ўвесь час яна прыняла у рожаніц каля 5 тысяч дзяцей.

Тав. Гарбачэнка карыстаецца вялікім аўтарытэтам у калектыве. Яе паважаюць за багаты вопыт, за добры падыход да людзей. Кожная жанчына, якой прыходзіцца бываць у Анны Казіміраўны, адчувае цёплыя мацярынскія пачуцці. Часамі, не лічачыся з тым, што трэба адпачыць пасля работы, яна падоўгу праседжвае каля ложкаў рожаніц, расказвае ім што-небудзь цікавае, захапляючае. Маладым мацярам дае парады як даглядаць грудных дзяцей. Чытае парады ўрачоў з часопісаў, альбо мастацкія расказы.

Безліч падзяк выносяць матцеры пажылой вопытнай акушорцы. Удзячны ёй і ўрачы і медсёстры. У Дрысенскім радзільным доме часта праходзяць практыку маладыя акушэркі. Тав. Гарбачэнка старанна растлумачвае ўсё, што іх цікавіць. Яна заўсёды ставіць сваёй мэтай дабіцца таго, каб практыканты атрымалі ўсё тое, што патрэбна ім для самастойнай работы.

Анне Казіміраўне больш 60 год. Але яна не адчувае старасці. Часта можна бачыць тав. Гарбачэнка ў хатах калгасніц, куды яна выязджае, каб на месцы аказаць медыцынскую дапамогу.

Тав. Гарбачэнка не адстае і ў грамадскім жыцці. Акуратна наведвае палітзаняткі, выносіць рад каштоўных прапаноў аб паляпшэнні работы радзільнага дома. Яна з'яўляецца прыкладам для многіх таварышоў па рабоце.

Ніна Елісеева.

ЯК БЫЦЬ?

Водзывы на пісьмо, змешчанае ў № 18 журнала

ІХ МОЖНА ПЕРАВЫХАВАЦЬ

Совецкая грамадскасць з абурэннем асуждае лёгкадумныя, распушчаныя, безадказныя паводзіны чалавека, які пакідае без увагі сям'ю і кідаецца ў пошукі вясёлых прыгод.

У нашай совецкай краіне, дзе жыватворчай крыніцай б'е пульс вялікай творчай працы будаўніцтва комунізма, той працы, у рытме якой нараджаюцца і выхоўваюцца людзі новага тыпу, няма месца безраздумным, распушчаным ілгунам, якія не даюць адчота сваім паводзінам, пакідаюць сям'ю, абманваюць, імкнучыся пазбегнуць якога-б там ні было ўдзелу ў выхаванні сваіх дзяцей.

Такія людзі губляюць свой маральны воблік, ператвараючыся ў нізкіх, маладушных і бясчэсных эгаістаў і вельмі лёгка могуць скаціцца на шлях ганебнага разлажэння і п'янства.

Яны не спрыяюць умацаванню сям'і—ячэйкі агульнага соцыялістычнага калектыва,— а разрушаюць яе, робяць злачынства, за якое павінны панесці адказнасць не толькі перад сям'ёй, але і перад усёй совецкай грамадскасцю. Людзі такога тыпу падобны хваробе, якую патрэбна як мага хутчэй вылечыць, не даць ёй углыбіцца, запусціцца. Іх можна і неабходна перавыхаваць, выправіць, давесці да іх свядомасці шкоднасць іх паводзін.

Чалавек-гуманіст, які здолен на вялікія справы для ўсяго чалавецтва і ў той-жа час здолен на сапраўдную, глыбокую, самую чалавечную любоў, вось якім павінен быць сапраўды совецкі грамадзянін. Такімі ярчайшымі прыкладамі для нас з'яўляюцца вялікія геніі чалавецтва—Маркс, Ленін, Сталін, Горкі. Іх жыццёвы слаўны шлях—лепшая школа для нас. Нават вялікія гістарычныя агульначалавечыя справы не адрывалі іх ад сям'і. На іх прыкладах выхоўваюцца людзі-большэвікі, якія бясстрашны і да канца самаадданы агульнаграмадскай дзейнасці і адначасова з'яўляюцца ўважлівымі, чулымі, самаадданымі членамі сям'і.

Калі чалавек ліцамерна гаворыць: «Люблю маці, жонку, дзіця» і ў той-жа час усямерна імкнецца адхіснуцца ад усякіх абавязкаў у сям'і, пазбягае нават прабывання ў ёй, шукае вясёлай кампаніі, забаў і п'янствуе, то ён згубіў пачуццё гуманнасці і ўсякую адказнасць за сям'ю.

Гэта ў сваю чаргу азначае, што сям'я згубіла сваю цэльнасць, здаровае адзінства і, з другога боку, калектыў прадпрыемства ці ўстановы згубіў здаровага работніка.

Вядома, наш час не такі, што-б дзеці, пакінутыя бацькам, аказаліся без прытулку і ўвагі. Яны выйдуць на шлях жыцця поўнацэннымі, як і ўся совецкая дзетвара, але ў гэтым не будзе заслугі іх распутнага бацькі.

Што можа зрабіць падруга Веры?

Яна вельмі правільна рашыла, што нельга лёгкадумна разрушыць сям'ю, што гэта пытанне патрабуе самага глыбокага і ўсебаковага абгаварэння, выкарыстання ўсіх магчымых мер, каб пазбегнуць крайняга кроку—развода.

Часцей за ўсё ў гэтым дапамагае калектыў, калі ён з увагай і чуласцю пойдзе насустрач жанчыне, актыўна ўмяшаецца ў справу, возьме кантроль за паводзінамі свайго звіхнуўшагася таварыша, пераканае, што яго паводзіны бясчэсныя, створыць здаровую абстаноўку таварыскай клапатлівасці, увагі, удзелу ў яго жыцці.

Калектыў зможа адарваць яго ад п'янай кампаніі, акружыць яго дзейнымі, здаровымі ў ідэйна-маральных адносінах таварышамі. Калектыў нагрузіць яго вытворчай і грамадскай працай, якая-б патрабавала ад яго максімум увагі, любві да справы, адданасці. Сама праца, яе плады, пераканаюць, якую карысць грамадству мог бы прыносіць ён сваім уменнем і сіламі, якія ён траціў у бяспутным разгуле, пошлых забавах.

Калі да таго ўмяшання калектыва далучыць уважлівую, разумную абстаноўку дома ў сям'і, без дакораў і раздражаючых сцэн, то выпраўленне чалавека ўпаўне магчыма, звіхнуты сустаў будзе пастаўлен на месца.

Дзяўчаты, якія не задумваючыся выходзяць замуж за чалавека, маючага сям'ю, паступаюць эгаістычна і недастойна. Яны гэтым не толькі патураюць безадказнасці бацькоў перад сваімі сем'ямі, разрушаюць сям'ю, робяць сіратамі дзяцей, папіраюць шчасце другіх, каб стварыць сваё, але і самі падвяргаюцца магчымасці такой развязкі, бо фундамент новай сям'і ўжо сам па сабе рыхлы і мае прычыны разладу.

Пытанне аб здаровай, устойлівай сям'і стала актуальным. Грамадскасць павінна актыўна адазвацца на яго, выказаць свае думкі, асудзіць тых, хто не змагаецца за моцную, дружную сям'ю, аснаваную на прынцыпах любві, гуманнасці.

С. Галіна, студэнтка.

Бацькоўскі камітет 47 Мінскай сярэдняй школы праводзіць вялікую грамадскую работу, дапамагаючы педагогам у комуністычным выхаванні вучняў. На здымку (на пярэднім плане): старшыня бацькоўскага камітэта П. В. Макушэк гутарыць з вучаніцай 3-га класа Варай Бернгард.
Фота Б. Хеніна (Фотохроніка БЕЛТА).

Трэба, каб уся справа выхавання, асветы і навучання сучаснай моладзі была выхаваннем у ёй комуністычнай маралі.

(В. І. ЛЕНІН)

ЦІКАВІЦЦА БЫТАВЫМІ ПЫТАННЯМІ

Комсамолка Н. у сваім пісьме, змешчаным у № 18 журнала «Работніца і калгасніца Беларусі», просіць параіць, як ёй быць. Гісторыя яе сапраўды сумная.

Учынкі мужа Н. несумяшчальны з совецкай мараллю. Ён ганьбіць комсамол, ганьбіць званне совецкага грамадзяніна. Грамадства павінна сурова асуджаць такіх пашлякоў, нягоднікаў, гэтых бяздушных бацькоў, якія цураюцца сваёй сям'і.

Муж Н. комсамолец. Ці цікавілася комсамольская арганізацыя асабістым жыццём кожнага комсамольца? Ці ведае яна, як вядзе сябе муж Н. дома, дзе ён праводзіць вечары, хто яго кампанія? А з пісьма-ж відаць, што яго таварышы—пошлыя людзі, якія п'янствуюць і гуляюць у карты.

Асуджаючы парочнасць мужа комсамолкі Н. трэба гаварыць і аб недахопах у рабоце той комсамольскай арганізацыі, у якой ён састаіць. Комсамольская арганізацыя павінна зразумець, што быт і паводзіны комсамольца дома гэта не толькі яго асабістая справа.

Дарагая Н., мы вам раім не адрывацца ад мас, быць як і раней актыўнай комсамолкай. Толькі ўпартая праца на вытворчасці, грамадская работа дапамогуць вам перажыць вашы непрыемнасці.

Шэвелева, работніца фабрыкі «Везувій».

Нова-Беліца.

БУДЗЬЦЕ МОЦНАЙ І МУЖНАЙ

Дарагая Н. Я прачытала ваша пісьмо «Як быць». Потым калектыўна з таварышамі абмеркавалі яго. Парады былі розныя, думкі разыходзіліся. Адны гавораць няхай Н. кіне мужа, яна астанецца не адна. Ленінска-Сталінскі комсамол і ўся грамадскасць дапамогуць ёй выхаваць сына.

Другія не раяць Н. разыходзіцца з мужам. Пакінуўшы сям'ю ён канчаткова зыйдзе з правільнай дарогі, будзе больш п'янстваваць і зусім стане непаправімым чалавекам.

Дарагая Н., вы яшчэ маладая. Жыццёвага вопыта ў вас амаль няма. Вы сабе не прадстаўляеце, як будзе цяжка сыну, калі ён астанецца без бацькі. Мая асабістая парада не разводзіцца. Маральна ўздзейнічайце на яго. Пагаварыце з ім цвёрда і рашуча.

Совецкая моладзь сур'ёзна глядзіць на сям'ю. Толькі такія, як ваш муж і муж Тані, ганьбяць яе.

Галоўнае не паддавайцеся цяжкасцям, якія сустрэліся ў вашым жыцці. Будзьце, як і раней, актыўнай, дзелавой. Будзьце моцнай, мужнай і гэта прымусіць вашага мужа зноў вярнуцца ў сям'ю.

А. Касімоўская.

Віцебск.

ТАКІЯ ПАВОДЗІНЫ АСУДЖАЕМ

Прачытаўшы пісьмо Н. «Як быць» на сходзе комсамольскай групы швейнай фабрыкі «Кастрычнік» мы прышлі к высновы, што комсамолка Н. сапраўды апынулася ў цяжкім становішчы. Па нашай думцы ў арганізацыі, дзе працуе муж Н., дрэнна пастаўлена работа па выхаванню моладзі. Комсамольская арганізацыя павінна ведаць не толькі як працуюць комсамольцы, але ці чыстаплотны яны ў быту, у сям'і.

Муж комсамолкі Н. папаў пад дрэнны ўплыў таварышоў і разам з імі маральна разлажыўся. Мы лічым, што комсамольская арганізацыя і грамадскасць, дзе ён працуе, могуць уздзейнічаць на яго і вывесці зноў на верны шлях.

Мы вельмі абураны учынкам комсамолкі, якая праводзіць час з Сашам. Яна эгаістка, лёгкадумна адносіцца да вельмі важнай у жыцці справы. Яе не турбуе тое, што ў Сашы ёсць сям'я,—жонка, пяцігадовы сын.

Паводзіны такіх комсамолак мы асуждаем.

Пісьмо падпісалі: **Галя Гараніна, Рэня Бурымская, Шэпсенвол, Фельдман.**

Мінск.



Юныя натуралісты Гарадокскага дзіцячага дома № 1 Віцебскай вобласці, удзельніцы Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1940 года (злева направа) Надзя Гаўрыленка, Дуся Чэрталысава і Рахіль Ліўшыц за адборам на пасенне гарбузоў ураджая гэтага года.

Фото І. Лосева (Фотохроніка БЕЛТА).

Валя

(АПАВЯДАННЕ)

— Чыя ты дзяўчынка і чаго плачаш?—спачувальна запытаў пажылы чырвонаармеец, нахіліўшыся над маленькай кволай дзяўчынкай, якая стаяла на канцы перона вакзала і, закрыўшы твар далонямі, плакала ўголас.

— Мам-кі-на!—не адрываючы далоняў ад твару і глытаючы салёныя слёзы—нараспеў адказала дзяўчынка.

— Ай разумніца,—задушэўна прагаварыў чырвонаармеец, азадачаны такім адказам.—А дзе-ж твая мамка будзе?—запытаў ён.

— Не ведаю-ю, — таксама скрозь слёзы адказала дзяўчынка і яшчэ галасней заплакала.

Вакзал, дзе адбылася гэта гутарка, знаходзіўся ў прыфрантовай паласе, шасцікалейная дарога аж да самага перона была занята воінскімі цяплушкамі, даўно не фарбаванымі пасажырскімі вагонамі, адкрытымі платформамі, на якіх, падклаўшы пад агонь бляху, чырвонаармейцы грэлі кацялкі з вадой.

Мора людзей было на самым пероне і тое, што Фёдар Сёмушкін у гэтым кіпучым прыфрантовым людскім катле заўважыў дзяўчынку, што плакала і спыніўся суцяшаць яе, гаварыла аб тым, што ў гэтага чалавека добрае сэрца.

— Не ведаеш дзе твая мама?—азадачана паўтарыў чырвонаармеец.—Вось бяда... Але плакаць перастань, перастань, Танюша.

Дзяўчынка зняла з твару худзенькія ручкі і, раптам усміхнуўшыся, са здзіўленнем паглядзела на салдата, які аброс барадой.

— А мяне не завуць Танюшай!

Чырвонаармеец збянтэжыўся.

— Выбачай, мілая, я цябе імем дачкі назваў. У мяне на Аршаншчыне дачка ростам якраз як ты, Танюшачка.

— А мяне Валяй завуць.

— Дзе-ж ты, Валя, маму згубіла?

Гадзіну, а можа і больш біўся Сёмушкін пакуль даведаўся, што дзяўчынка са сваёй мамкай з вёскі Чарніца ехалі да цёткі. Па дарозе маці захварэла, яе завезлі ў барак, а дзяўчынку туды не ўзялі.

— Нельга табе тут—тыфус!

Нейкая добрая жанчына з больнічнага барака ўзялася правадзіць яе на вакзал, каб адправіць да цёткі. Па дарозе яна гладзіла Валюшку па валасах, спачувальна і пяшчотна прыгаварвала: «Сіротка мая, сіротка»...

А потым Валя ехала-ехала пакуль не апынулася на гэтым шумным пероне, плачучай перад Сёмушкіным.

— Так, гісторыя непрыгожая, зусім дрэнь гісторыя,—сказаў чырвонаармеец, дастаючы з адной кішэні бляшаную табакерку, а з другой—спісаны кавалак паперы.

— Што-ж цяпер з табой, Валюшка, рабіць. І есці ты, відаць, хочаш. А, хочаш? Маўчыш, стала быць...—Дзяўчынка хоць і адчувала ў ваенным ласку і клопаты, але спалоханая перажытым—ёй усё гэта здавалася цяжкім сном, зноў замаўчала і як дзікун, прысела на кортачкі, забіўшыся ў куток пярона паміж наваленых гарой мяшкамі.

— Валюшанька, я збегаю да вакзальнага начальства і распытаюся ці няма якога-небудзь прытулка тут. А ты глядзі—чакай мяне і нікуды не ідзі. На, хлебца вазьмі!

Дзяўчынка не паварочвалася і тады чырвонаармеец сам палажыў ёй на калені акраец чорствага хлеба...

Вакзальнае начальства нічога не ведала і Фёдар Сёмушкін бегаў у горад распытваць ці ёсць дом для сірот. Яму растлумачылі, што на Загароднай вуліцы ёсць. Пабег туды, а калі ўспацелы і стомлены вяртаўся на вакзал, страшэнна хваляваўся ці застане ён дзяўчынку на тым самым месцы. Валя, паклаўшы галаву на мех і накрыўшыся паліто, салодка і бесклапотна спала.

Чырвонаармейцу шкада было будзіць стомленае дзіця і ён, прысеўшы на мех, чакаў покуль яна праснецца.

***

— Так пакідаю вам гэту юную грамадзянку і вельмі прашу замяніць ёй бацьку, маці і іншую радню.—Сёмушкін жартаваў і гаварыў вясёлым тонам, каб узняць настрой у дзяўчынкі. Яна паслухмяна пайшла за ім, а калі пад вечар спыніліся каля цаглянага будынка і чырвонаармеец сказаў: «Ну вось дачурка і прышлі ў твой новы дом», яна раптам злосна прагаварыла: «Не вядзі мяне сюды, дзядзька, не пайду».

— Як гэта не пойдзеш?—здзівіўся чырвонаармеец.—Прападаць хочаш?—з гораччу прагаварыў ён.—Пойдзем, пойдзем, Валюшка. Тут добра і накормяць і спаць пакладуць. А цёткі тут добрыя, як маці родная.

Пойдзем, Валюшка.

У прыёмнай Валя ўчапілася за руку чырвонаармейца і не хацела адпусціць яе.

— Аставайся і ты са мной,—нахіліўшы галаву і вось-вось збіраючыся расплакацца, сказала яна.

— Я-б з вялікім задавальненнем, але не дазволяць. Пакінеце?—жартліва запытаў ён у пажылай жанчыны з ласкавымі

вачыма, якая ўзнялася ім насустрач і пяшчотна абняла Валю.— Ну, вось бачыш, мяне, як не прашуся, не пакідаюць. На фронт трэба, а цябе яшчэ ўпрошваюць,—аставайся, роднепькая, аставайся. Ты не палохайся, тут табе добра будзе. Праўда, цёця?

— Праўда,—пацвердзіла пажылая жанчына.

— А я покуль не паеду, цябе наведваць буду, а потым пісьмо табе напішу. Я пісаць люблю і Танюшку сваю вывучыў. Шчаслі-ва табе аставацца... Пабягу—і ён, баючыся выдаць слёзы, якія паказаліся на вачах, адзеў скамечаную будзёнаўку і не аглядаючыся вышаў.

Валю распранулі, памылі, накармілі і сама цёця загадчыца паклала яе ў ложак, накрыла коўдрай і ціхенька пацалавала ў лобік.

Прозвішча свайго дзяўчынка не памятала:

— Мамку завуць Парася, татку—Іван. Ён на вайне і з вайны не вярнуўся, а родам мы з вёскі Чэрніцы...

Так і празвалі яе Валя Чэрніца. Кругленькая, з чырвонымі шчочкамі, вясёлая, рухавая яе цяпер цяжка было і пазнаць.

Прайшло сем месяцаў жыцця ў новай абстаноўцы. Валя прызвычаілася, зраднілася і ёй здавалася, што яна ўжо даўно-даўно жыве ў гэтым дружным калектыве.

— Валя, Валя!—разнеслася аднойчы па карыдоры, — табе пісьмо.

Дзяўчынка ўзяла пісьмо і пачала недаверліва круціць канверт. Не памыліліся—ці ёй гэта? Ад каго ёй раптам пісьмо.

— Не мне,—усё яшчэ не верачы, сказала яна, зварочваючы пісьмо падругам.

— Валечка, табе, вось-жа на канверце напісана: Валі.

Чыталі сабраўшыся ў кружок, калектыўна.

«У самых першых радках нашага пісьма, Валечка, дазвольце даведацца, як вам на новым месцы жывецца, ці не крыўдзяць там вас, ці кормяць і як вам там дарагую маці замяняюць. А мы, Сёмушкін, цяпер у шпіталі пасля фронта і паранення ў правую нагу, якую дактары зняць збіраюцца. Мы не адчайваемся, чаго і вам жадаем. Танюшачке я адпісаў, што сустрэў Валечку, устроіў у дзіцячы дом жыць. А затым астаюся чырвонаармеец 97 палка Фёдар Канстанцінавіч Сёмушкін, цяпер у Пермскім шпіталі на вылячэнні з гарачым брацкім прывітаннем астаюся Фёдар Сёмушкін».

Прачыталі апошнія радкі і паглядзелі на Валю. Яна пабляднела, яе дыханне стала прарывістым.

— Нагу, нагу аднімуць у дзядзі Федзі,—шаптала яна ні на кога не гледзячы і ні да каго не зварочваючыся.

Імя гэтага чалавека яна ўспамінала часта і з любоўю, хоць бачыла яго толькі адзін дзень. Ёй здавалася, што яна ўжо даўно яго ведае і варта ёй было закрыць вочы, як яна прадстаўляла сабе вобраз вясёлага і бойкага чырвонаармейца, які гутарыў з ёй.

Праз тры дні дэлегацыя выхаванцаў дзіцячага дома ішла адпраўляць пасылку «у Пермь раненаму чырвонаармейцу Фёдару Сёмушкіну ў рукі». У пасылцы на самым дне было акуратна складзенае першае пісьмо, напісанае Валей Чэрніцай:

«Дзядзя Федзя вельмі палохаюся за вашу рану і напішыце як вам».

Але больш пісем ад чырвонаармейца Сёмушкіна не было.

* * *

Праз семнаццаць год высокая стройная дзяўчына з вялікімі быццам сакавітыя вішні цёмна-бліскучымі вачыма, скончыўшы політэхнічны інстытут ад'язджала на завод. У чаканні прыхода скорага поезда яна хадзіла па чысценькаму залітаму свежым асфальтам перону і ўспамінала сябе плачучай, спалоханай на гэтым-жа вакзале 17 год назад. Як даўно гэта было, а быццам учора... Сёмушкін. Яшчэ і цяпер у яе перад вачыма быў яго дабрадушны твар з вясёлай усмешкай... Сёмушкін. І, раптам спыніўшыся яна з ліхарадачнай хуткасцю адкрыла партфель і дастала пісьмо, якое атрымала ўчора з завода, куды яе пасылалі на работу. Пачала чытаць: «Інжынеры нам вельмі патрэбны і мы з нецярпеннем чакаем вашага прыезду. Прыязджайце хутчэй. З прывітаннем дырэктар Тацяна Сёмушкіна. Гэта яго Таня, Танюшачка—прашаптала Валя.

Каля перона, весела пыхкаючы, спыніўся скоры поезд.

Е. Садоўскі.

Выдача совецкіх пашпартоў насельніцтву Бесарабіі.
На здымку; У другім пашпартным участку пры Кішынёўскай табачнай фабрыцы першы пашпарт выдан стаханаўцы-многастаночніцы гільзавага цэха Серафіме Владзіміраўне Бакшчанінай. Тав. Бакшчаніна штодзённа выконвае норму на 250—270 процантаў.
Фото. В. Іванова (Фото ТАСС).

У дзіцячым садзе № 2 (Мінск) Цесным гуртком абкружалі дзеці кіраўніцу Ёлену Фамінішну Элаткевіч. Вось яна ўзяла першыя акорды песні „Если завтра война"... Дзеці зараз-жа падхватваюць любімую песню. Другая група рэбят ваінственна строіцца ў рады і рыхтуе сваю „грозную зброю".

ЖАНЧЫНЫ І РЭЛІГІЯ

Рэлігія ўзнікла ў першабытныя часы на глебе бяссілля дзікуноў у барацьбе з прыродай. Прадметы і стыхійныя з'явы знешняй прыроды прымалі ва уяўленні дзікуна форму звышнатуральных сіл, адароных волею і сазнаннем.

З цягам часу, калі грамадства раздзялілася на класы, на эксплаататараў і эксплаатуемых, калі ўзнікла дзяржава, як зброя класавага панавання, народныя масы пачалі адчуваць на сябе на раду з гнётам прыроды яшчэ больш цяжкі гнёт эксплаатацыі. Прыціснутыя стыхійнымі сіламі знешняй прыроды і непасільным цяжарам эксплаататарскага ладу, народныя масы шукалі «нябеснага заступніцтва», шукалі супакаення ў рэлігійных казках аб нябеснай узнагародзе.

Таварыш Сталін на II З'ездзе Советаў у 1924 годзе гаварыў: «Дзесяткі і сотні разоў імкнуліся працоўныя на працягу вякоў скінуць з плеч прыгнятальнікаў і стаць гаспадарамі свайго становішча. Але кожны раз, разбітыя і аганьбаваныя вымушаны былі яны адступіць, тоячы ў душы крыўду і ўніжэнне, злобу і адчай і накіроўваючы погляды на невядомае неба, дзе яны спадзяваліся знайсці збавенне». («Аб Леніне», стар. 28—29, 1939 год).

Прыгнечаныя масы народа вякамі прыбягалі да рэлігіі таму, што не бачылі выйсця з свайго ўласнага становішча. У рэлігіі, як у опіуме, шукалі яны забыцця, шчасця, суцяшэння. У артыкуле «Соцыялізм і рэлігія», які напісан Леніным у 1905 годзе напярэдадні Маскоўскага ўзброенага паўстання, аб рэлігіі сказана так: «Рэлігія ёсць адзін з відаў духоўнага гнёта, які ляжыць скрозь і ўсюды на народных масах, задаўленых вечнай работай на другіх, нястачай і адзіноцтвам. Бяссілле эксплаатуемых класаў у барацьбе з эксплаататарамі таксама немінуча параждае веру ў лепшае замагільнае жыццё, як бяссілле дзікуна ў барацьбе з прыродай параждае веру ў багоў, чарцей, у цуды і т. п.» (Ленін, т. VIII, стар. 419).

Усюды і заўсёды рэлігія параджалася і падтрымлівалася прыдаўленасцю людзей, жорсткімі ўмовамі жыцця, класавым гнётам, нішчатой і прыніжэннем.

Значыцца перамагчы рэлігію, вызваліць народ ад рэлігійных забабонаў немагчыма ва ўмовах капіталістычнага ладу. Неабходна знішчыць соцыяльныя карэнні рэлігіі—гнёт і эксплаатацыю. Сапраўды, толькі ў рэзультаце Вялікай Кастрычніцкай Соцыялістычнай рэволюцыі, якая разбурыла эксплаататарскі лад у нашай краіне, нанесен сакрушальны ўдар па рэлігіі і рэлігійных забабонах.

Цяжкай і горкай была доля рабочага, працоўнага селяніна ў часы царызма, цяжкая яна і цяпер у краінах капітала. Але гэты цяжар эксплаататарскага гнёту ў царскай Расіі і ў капіталістычных краінах кладзецца ў яшчэ большай ступені на жанчыну. Калі жанчына выконвае на капіталістычнай фабрыцы такую-ж работу, што і мужчына, то плоцяць ёй значна менш чым мужчыне. Ні ў адной капіталістычнай краіне, нават у самай «дэмакратычнай», як Амерыка, жанчына не мае аднолькавых з мужчынай выбарчых правоў. Ленін у артыкуле «Совецкая ўлада і становішча жанчыны» у 1919 годзе пісаў: «У буржуазнай рэспубліцы (г.-зн. дзе ёсць прыватная ўласнасць на зямлю, фабрыкі, заводы, акцыі, і інш.), хаця-б гэта была самая дэмакратычная рэспубліка, становішча жанчыны *нідзе ў свеце, ні ў адной самай перадавой краіне* не стала ўпаўне раўнапраўным. І гэта не гледзячы на тое, што з часу Вялікай Французскай (буржуазна-дэмакратычнай) рэволюцыі прайшло больш 1¼ века... Не можа быць, няма і не будзе сапраўднай «свабоды», пакуль няма свабоды для жанчыны ад прывілей па закону ў карысць мужчыны, свабоды для рабочага ад іга капітала, свабоды для працоўнага селяніна ад іга капіталіста, памешчыка, купца». (Ленін, т. XXIV, стар. 517 і 518).

Эксплаататарскі погляд на жанчыну, як на непоўнапраўную істоту, распаўсюджан вельмі даўно. Гэты погляд на жанчын

ярка паказан у рэлігіі. Рэлігія адзываецца аб жанчыне ў самых грубых выразах. Служыцелі рэлігійнага культа—папы, ксяндзы, равіны, мулы і сектанскія прапаведнікі—усе яны са злосцю гавораць аб жанчыне.

Хрысціянскі прапаведнік Іоан Златауст параўноўвае жанчын з размаляванымі трунамі. Яўрэйскі талмуд заяўляе, што жанчына ніжэйшая і нячыстая істота, пазбаўленая чалавечага дастоінства. Рэлігія забараняе жанчыне ўваходзіць у тыя месцы, якія лічацца свяшчэннымі. У праваслаўнай царкве жанчына не мае права ўвайсці ў алтар. У мусульман жанчына не мае права ўваходзіць у мячэць. У яўрэйскай сінагоге для жанчын адведзена асобнае аддзяленне, на манер чардака. У іудзейскай рэлігіі ёсць малітва, якую кожную раніцу чытае веруючы мужчына: «Хвала табе божа, што ты не зрабіў мяне жанчынай». У 585 годзе сярод хрысціянскіх папоў у віленскім саборы ўзнікла спрэчка аб тым, ці ёсць душа ў жанчыны. Толькі большасцю аднаго голаса было рашано, што жанчына—чалавек і мае душу.

Рэлігія дапускае гандаль жанчынамі. Гэты гандаль мае месца ў капіталістычных краінах. Тысячы няшчасных дзяўчат з беднякоў прадаюцца ў публічныя дамы. У Японіі тысячы публічных дамоў напоўнены праданымі жанчынамі. Сяляне-беднякі, прыдаўленыя страшнай эксплаатацыяй, прадаюць сваіх дочак і сясцёр у публічныя дамы і фабрыкантам, спадзяючыся на выручаныя грошы трохі наладзіць сваю гаспадарку.

Аб няроўнасці мужа і жонкі ў сям'і гаворыцца ва ўсіх рэлігійных вучэннях. У адным з так званых пасланняў апостала Паўла гаворыцца: «Жонка ды баіцца свайго мужа».

У зборніку царскіх законаў аб рабскім становішчы жанчыны ў сям'і было запісана так: «Жонка абавязана павінавацца свайму мужу, як главе сямейства».

Такія адносіны, якія ўстанавіліся паміж мужам і жонкай пры эксплаататарскім ладзе, падтрымліваліся рэлігіяй. Вельмі характэрны некаторыя вясельныя абрады і звычаі, якія трымаліся цэлымі стагоддзямі. Пасля шлюба ў царкве бацька нявесты перадаваў жаніху плётку, якая называлася «дзяржавай». Гэтым бацька быццам перадаваў мужу сваю ўладу над дачкой. Муж павінен быў тут-жа тры разы ўдарыць плёткай сваю маладую жонку. Збіенне жонкі ў дарэволюцыйнай Расіі было звычайнай з'явай. Па гэтаму повааду складаліся дзікія пагаворкі: «Любі жонку як душу, і калаці яе як грушу», «Жонку не біць і мілу не быць», «Бей жену больней, будут щи вкусней».

Корні няроўнапраўнасці прыніжанасці жанчыны пры капіталізме ўкараніліся ў гаспадарчым і палітычным яе жыцці.

Таварыш Сталін на прыёме калгасніц-пяцісотніц 10 лістапада 1935 года гаварыў: «На самой справе, калі падумаеш, што прадстаўлялі сабой жанчыны раней, у стары час. Пакуль жанчына была дзяўчынай, яна лічылася, так сказаць, апошняй з працоўных. Працавала яна на бацьку, працавала не пакладаючы рук, і бацька яшчэ папракаў яе: «Я цябе кармлю». Калі яна станавілася замужняй, яна працавала на мужа і муж яе зноў-жа папракаў: «Я цябе кармлю». Жанчына ў вёсцы была апошняй з працоўных».

У такім-жа становішчы, у якім знаходзіліся працоўныя жанчыны да рэволюцыі ў Расіі, знаходзяцца цяпер працоўныя жанчыны ў капіталістычных краінах.

Вялікая Кастрычніцкая Соцыялістычная рэволюцыя знішчыла ўсе абмежаванні для жанчыны. Толькі ў Совецкім Саюзе жанчына фактычна раўнапраўная з мужчынай.

На гістарычным VIII Надзвычайным З'ездзе Советаў, на якім была зацверджана Сталінская Канстытуцыя прысутнічала 419 дэлегатаў жанчын. Сярод іх былі калгасніцы, артысткі, настаўніцы, урачы і работніцы другіх прафесій.

Правы жанчыны на працу поўнасцю ажыццёўлены ў калгасней вёсцы. Аб гэтым таварыш Сталін гаварыў на прыёме калгасніц-пяцісотніц 10 лістапада 1935 года: «Цяпер жанчына, калі яна працуе і ў яе ёсць працадні, яна сама сабе гаспадыня. Я помню, на другім калгасным з'ездзе вёў гутарку з некалькімі таварышамі-жанчынамі. Адна з іх, з Паўночнага края гаварыла:

«Годы два назад ніхто да мяне на двор з жаніхоў заглядаць не хацеў. Беспрыданніца! Цяпер у мяне пяцьсот працадзён. І што-ж. Адбою няма ад жаніхоў. Хочуць, гавораць, жаніцца: а яшчэ пагляджу, сама выбіраць буду жаніхоў».

Пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна мы разгромілі эксплаататарскія класы. Мы падавілі іх супраціўленне будаўніцтву новага жыцця. Аднак, думаць, што ў нас ўсё з ворагам пакончана нельга. Ёсць яшчэ ў нашай краіне рэшткі разгромленых класавых ворагаў. Яны вядуць шкодную агітацыю сярод найбольш адсталых працоўных. Гэтыя рэшткі класавага ворага часта прыкрываюцца рэлігіяй, якая з'яўляецца ідэалогіяй варожай соцыялізму.

Не гледзячы на тое, што велізарная большасць жанчын у нашай краіне не верыць у бога, усё-ж многія яшчэ жанчыны, асабліва ў вёсцы вераць у рэлігійныя забабоны. Вось чаму неабходна ўзмацніць антырэлігійную прапаганду, прыцягваючы да гэтай работы актывістак-бязбожніц. Выкрыццё эксплаататарскай сутнасці рэлігіі і шкоднасці рэлігійных забабонаў павінна быць сустаўной часткаі усёй нашай агітацыі і прапаганды, усёй работы па комуністычнаму выхаванню мас і знішчэнні перажыткаў капіталізма ў свядомасці людзей.

Ф. Л. Доўгаполаў.

Адказны рэдактар Г. В. КАГАН.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Совецкая, 49, 1 паверх. Тэл.—24058

Друкарня імені Сталіна. Зак. № 2964. Тыраж 13.000 экз. У4812.
Здана ў друк. 18/XI—40 г. Падпісана да друку 29/XI—40 г. У нумары 2½ друк. арк. 120.140 друк. знак.

А.11 РКБ ЗБ
РАВНИЧИ АЛІПАЕЦ
БИБ.КЕЮІНЗ Т
2 1.12

Цана 20 кап.

На здымку: Нядаўна пабудаваны радыёзавод імені Молатава ў Мінску. Зверху ўзнагароджаныя пачотнымі граматамі Вярхоўнага Совета БССР за паспяховае выкананне ўрадавага задання па будаўніцтву завода тт. П. І. Заяц, А. Т. Ішчанка, Н. І. Юшчанка.

Фото І. Рабіновіча.

Мая падзяка

Я маці семярых дзяцей. Мне хочацца расказаць аб сваёй сям'і, аб тым, як Совецкая ўлада дапамагае выхоўваць нам малышоў. Па нацыянальнасці я немка. У стары час скончыла 4 класы. Далей вучыцца не магла. У горадзе хаця і былі гімназіі, семінарыі, але для нас і для другіх беднякоў дзверы туды былі закрыты. Муж мой таксама малапісьменны.

За тое мы вельмі шчаслівы, што нашы дзеці вучацца, што яны могуць атрымаць не толькі сярэднюю, а і вышэйшую асвету. Яны могуць набыць любыя спецыяльнасці, якія ім толькі спадабаюцца. У мяне чацвёра дзяцей вучыцца. З іх тры дачкі—у поўнай сярэдняй школе. Старшы сын працуе ўжо слесарам аўтамайстэрань і адначасова вучыцца, павышае свае веды па слясарнай справе. Дочкі вучацца добра. Вікторыя з класа ў клас пераходзіць з ганаровай граматай. Роза і Анна таксама атрымалі за паспяховую вучобу па некалькі пахвальных грамат ад школы.

Мае дзеці не адчуваюць такіх нястач, якія перажыла я ў дзяцінстве. Мая маці таксама была многадзетнай і трэба зразумець, як цяжка ёй было пракарміць нас. Бацька пайшоў на фронт у час імперыялістычнай вайны. Маці адна працавала на ўсіх нас. Памятаю як мы кідаліся да яе, калі яна позна вечарам прыходзіла з работы і прыносіла чорны хлеб. Малако, мяса для нас былі рэдкасцю.

А зараз мая сям'я забяспечана ўсім. Муж і сын зарабляюць добра. Кожны год мы атрымліваем ад дзяржавы на выхаванне дзяцей дапамогу—2000 рублёў. Гэтыя грошы выдаткоўваю на дзяцей. Я вельмі люблю дзяцей і заўсёды клапачуся, каб яны былі здаровымі, сытымі, чыста апранутымі, каб яны добра паспявалі ў школе.

Я, як маці, выключна многа ўвагі аддаю выхаванню дзяцей. Нам, бацькам, хочацца, каб яны выраслі дастойнымі сынамі і дочкамі нашай цудоўнай радзімы. Мы бязмежна ўдзячны совецкаму ўраду, комуністычнай партыі і яе кіраўніку роднаму Сталіну за тыя велізарныя клопаты, якія праяўляюць яны аб нашых дзецях.

Елена Каспараўна Круг.

Мінск

АБ ДЗЕЦЯХ

З года ў год расце нараджальнасць у нашай краіне. Кожная маці ведае, што новы чалавек ў сям'і з'яўляецца радасцю, што Совецкая ўлада робіць многа для таго, каб забяспечыць дзецям шчаслівае дзяцінства.

Работніца нашага камбіната Евероменка мае шасцёра дзяцей.—Дзеці,—гаворыць яна,—для мяне не абуза. Я ганаруся тым, што сын мой ужо ў Чырвонай Арміі. Выхоўваць дзяцей дапамагае мне дзяржава.

Але хачу сказаць аб некатарых недахопах, якія маюцца яшчэ на месцах. Зараз летнія канікулы. Многія дзеці выехалі адпачываць у санаторыі, лагеры, на дачы. Але многія засталіся ў горадзе. Неабходна арганізаваць і для гэтых дзяцей такія ўмовы, каб яны маглі весела правесці лета. Аб гэтым у нас мала думаюць. Мая дачка (якая з поспехам перайшла ў шосты клас) скардзіцца на тое, што ёй сумна. Яна ўмее іграць на гітары, а струннага гуртка няма. У выходныя дні дэманстрыруюцца кінокарціны, на якія дзяцей да шаснаццаці год не пускаюць.

Неабходна лепш заняцца пытаннем забеспячэння летняга адпачынка дзяцей.

П. Шэвелева.

Новабеліца

У сям'і Елены Каспараўны Круг. Старшая дочка комсамолка Аня (справа) чытае мацеры, сёстрам і брату свежую газету.
Фото І. Рабіновіча.

Права мацеры

У былой панскай Польшчы не было такога закона, які-б абараняў інтарэсы жанчыны-мацеры і дзіцяці. На велізарнае бяспраўе, нішчату і пакуты асуджаны жанчыны і дзеці ў буржуазным грамадстве.

Фармальна ў капіталістычных краінах таксама існуе закон аб прысуджэнні аліментаў. Ён стаіць на абароне багатых, а не на праўдзе. Па закону, які існаваў у былой панскай Польшчы, было так: калі адказчык па аліментнай справе падкупіць многа сведак і яны скажуць, што маці ў часе цяжарнасці жыла не толькі з ім, але і з другімі, то аліменты на гэта дзіця не прысуджаюцца. У рэзультаце, пануючы клас, барчукі, панскія сынкі маглі накупіць сведкаў і справа канчалася ў іх карысць, а не ў карысць мацеры і дзіцяці. Багацеі ў рэзультаце гэтага, як маглі здзекваліся над жанчынамі.

Вось факт. У гаспадара буйнага рэстарана Віцько працавала шаснаццацігадовая дзяўчына Анна Чуйко. У яго быў сын гімназіст. Гэты барчук прымусіў дзяўчыну жыць з ім. Праз некаторы час ён паехаў на вучобу. Чуйко Анна засталася цяжарнай. Доўгі час яна ў пакутах скрывала сваё становішча ад гаспадароў. Калі-ж цяжарнасць стала прыкметнай, Чуйко вымушана была расказаць усё бацькам.

І што-ж чакала маладую маці? Бацькі Віцько, не выслухаўшы нават, аблаялі яе і зразжа выгналі з дому, не даўшы і пераначаваць. Цяжарнай жанчыне не было куды дзявацца. Аб рабоце і думаць не прыходзілася,—нікому яна не была патрэбна цяпер.

Але вось прышло знамянальнае 17 верасня 1939 года—Доблесная Чырвоная Армія прынесла вызваленне працоўным жанчынам Заходняй Беларусі. Чуйко Анна нарадзіла ўжо пры совецкай уладзе. Яе маленькае дзіця стала грамадзянінам Совецкага Саюза.

Перад судом 1 участка горада Беластока аліментная справа Чуйко. Напярэдадні бацька Віцько запрасіў да сябе таварышоў сына, пачаставаў і абяцаў узнагароду, калі яны пойдуць у суд і скажуць, што ўсе яны, не толькі сын яго, жылі з Аннай Чуйко. Перад судом некалькі мярзотнікаў, падкупленых Віцько. Яны прышлі, каб зневажыць і прынізіць маладую маці, але пралічыліся. Старыя подлыя законы канулі ў вечнасць. Совецкі суд судзіць справядліва. Чуйко цяпер штомесячна атрымлівае на ўтрыманне дзіцяці 100 рублёў ад Віцько.

Толькі совецкія законы адзіна правільныя. Яны ахоўваюць правы мацярэй і дзяцей.

Ліўшыц, загадчык соцыяльна прававым аддзелам Інстытута аховы мацярынства і дзяцінства.

Выхаванцы дзіцячага сада № 1 (Брэст) на прагулцы ў гарадскім садзе. Фота В. Лупейка (Фотахроніка БЕЛТА).

Санаторныя яслі

Гэта вялікі цагляны будынак з мноствам пакояў. Кругом яго сад. Двор зарос мурожнай травой, высаджан кустамі ягад. Тут змяшчаюцца санаторныя яслі горада Мінска.

Як прыемна глядзець на гэтых малышоў, на іх гульні, забавы, на ўтульныя светлыя пакоі. Чамусьці не адчуваецца, што тут знаходзяцца слабыя дзеці, што кожны з іх атрымлівае адпаведнае лячэнне. Яны жывуць у добрых умовах, акружаны увагай і клопатамі з боку абслугоўваючага і медыцынскага персанала.

Дзіцячыя санаторныя яслі працуюць ужо два гады. За гэты час тут пабывала не мала дзяцей горада. За мінулы 1939 год атрымала лячэнне 245 дзяцей. У гэтым годзе ў яслях пяць груп. Дзеці разбіты па ўзросту. Кожная група мае свой абслугоўваючы персанал—сястру і няню. Санаторый забяспечан добрымі кадрамі. Ёсць спецыялісты па вушных хваробах, па вочных хваробах і скураных. Ёсць і педагог.

Санаторый добра забяспечан усімі неабходнымі медыкаментамі. Ёсць рэнтгенаўскі кабінет, кварц і лабараторыі. Як толькі прыбывае ў санаторныя яслі дзіця, яго правяраюць урачы, прасвечваюць рэнтгенам. Толькі пасля гэтага прызначаецца яму курс лячэння.

Вялікі ўплыў на выздараўленне рэбят аказвае рэжым і харчаванне. Дзяцей кормяць пяць разоў у дзень. Два разы даюць сокі. Многа часу дзеці праводзяць на двары, на свежым паветры. Тут яны іграюць і днём спяць на верандзе. Зімой таксама спяць на верандзе ў цёплых спальных мяшках. Маюцца спецыяльныя пакоі, як начныя так і дзённыя.

У санаторыі ясельнага ўзроста (Мінск). На здымку: Група дзяцей, якія прышлі ў санаторый з паражэннямі ў лёгкіх. Цяпер яны выздаравелі і ўвальюцца ў агульныя яслі разам з усёй шчаслівай дзетворой. Злева направа: Надзя Васілеўская, Алік Петровіч, Вера Мінаева і Валя Міхайлава.
Фото І. Рабіновіча.

У яслях добры калектыў. Асобыя таварышы, як Лазоўская, Грандэ, Кавальчук, Касач, Яброва, з'яўляюцца выдатнікамі сваёй работы. Яны з гонарам выконваюць пачотную і адказную справу лячэння і выхавання дзяцей.

У санаторыі ясельнага ўзроста (Мінск) створаны ўсе ўмовы для хутчэйшага выздараўлення дзяцей.
На здымку: Група дзяцей гуляе ў садзе.
Фота І. Рабіновіча.

Таварыш Лазоўская працуе санітаркай старшай групы. Мае вопыт работы з дзецьмі. Яе любяць малышы і яна яшчэ больш любіць дзяцей. Аня Лазоўская з'яўляецца лепшай санітаркай санаторных ясляў.

Таксама прыкладны ў рабоце Слава Сімановіч і кіраўніца таварыш Грандэ. Тав. Грандэ на гэтай рабоце 22 годы. Слава Сімановіч малады совецкі ўрач. Не гледзячы на тое, што гэта першыя шагі работы, але аб ёй можна пачуць вельмі добрыя водгукі. Яна аддае выключна многа ўвагі для таго, каб хутчэй і лепш папраўляліся дзеці.

Дзеці—будучыя актыўныя будаўнікі новага грамадства. Вялікія і нястомныя клопаты аб іх у нашай краіне.

Н. Старавойтава

Горкі і сучаснасць

Чатыры годы прайшло з таго дня, калі ворагі совецкага народа зладзейскі ўмярцвілі геніяльнага мастака слова, роданачальніка сацыялістычнай літаратуры, вялікага сына вялікага народа—Максіма Горкага. Але «як жывы з жывымі» гаворыць і сёння з намі пісьменнік, для якога ідэя міжнароднай пролетарскай салідарнасці была кіраўніцтвам усёй яго дзейнасці—літаратурнай, публіцыстычнай, навуковай, грамадскай. Увасабляючы і прапагандыруючы гэту ідэю, Горкі напісаў дзесяткі адозваў, стварыў светлы вобраз «Мацеры», «Казкі аб Італіі», паказаў, як нават у глухія годы рэакцыі ў сазнанні радавых рабочых не ўмірае мысль аб адзінстве інтарэсаў рабочых усіх краін. Увасабляючы гэту мысль, Горкі вучыў ведаць ворага: Клім Самгін—правобраз сучасных сацыял-дэмакратычных прыслужнікаў—імперыялізма. Цяжка пераацаніць павучальнае значэнне гэтай фігуры здрадніка, чыю подлую душу мастак раскрыў у яе патаемнейшых пабуджэннях.

У дні, калі ўладаю імперыялістаў мільённыя народныя масы кінуты ў бездань новай сусветнай вайны, мы ясна чуем голас пісьменніка, які ўсёй сілай свайго палкага слова абрушваўся на арганізатараў крывавай бойні.

Вайну 1914—1918 годаў Горкі сустрэў з найвялікшым абурэннем і ясным сазнаннем яе страшэннай злачыннасці. У той час, калі чад шавінізма дурманіў такія моцныя розумы, якім быў Плеханаў, Горкі праводзіў у сваёй публіцыстыцы антываенную прапаганду, ён звярнуўся са словам прывітання к Бернарду Шоу: «Паважаны Бернард Шоу! — пісаў Аляксей Максімавіч у 1916 годзе.—Да мяне дайшла радасная чутка аб тым, што вы стаіце па-за хаосам страсцей, узбуджаных шалёнай вайной, якая знішчае мільёны найбольш актыўнага, найбольш здольнага да творчасці насельніцтва нашай планеты».

З самага пачатку свайго актыўнага ўдзелу ў барацьбе рускага рабочага класа Горкі ўсёй сваёй істотай пранікся ідэямі сусветнага пролетарскага адзінства. Вось чаму яд шавінізма ніколі не дзейнічаў на яго, і Горкі не стамляўся ярасна змагацца з «заалагічным», па яго выражэнню, нацыяналізмам, не стамляўся выкрываць яго «прыгожую» хлусню.

У пачатку 900-х годаў малады Горкі піша першамайскія лістоўкі. А ў крытычныя мінуты першай рускай рэволюцыі ён звяртаецца да амерыканскіх, нямецкіх, французскіх, англійскіх рабочых з заклікам дапамагчы рускім братам па класу. «Да вас,—пісаў Горкі ў адной з адозваў у 1906 годзе,—да вас, рабочыя, сапраўдныя гаспадары ўсёй зямлі—я звяртаюся!

Як перад усім рабочым людам свету, перад вамі ляжыць шлях барацьбы за вызваленне чалавека... з палону капітала і дзяржавы, лакейска служачага яму супроць вас.

Гэтая барацьба хутка абхопіць увесь свет... Гэтая барацьба немінуча, як смерць,—і яна пачалася.

Першым атрадам сусветнай арміі рушыў у бітву рускі рабочы... І калі рускі рабочы пераможа—рабочыя ўсёй Еўропы, усяго свету пачэрпнуць у гэтай перамозе натхненне і сілу, і ўрокі для сябе... Бо, паўтараю, у гэтай барацьбе перамога адных — перамога ўсіх!..

І няхай надгробным пяяннем здыхаючаму ад перасычэння свету... прагучыць наш баявы, святы наш лозунг, лозунг брацтва народаў:

«Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!»

Многія радкі гэтай адозвы гучаць лозунгамі сучаснай барацьбы рабочых і працоўных свету. Так верна вызначыў Горкі значэнне рэволюцыі 1905 года, як важнейшага этапа ў рэволюцыйнай барацьбе сусветнага пролетарыята.

Калі-ж царскія каты з дапамогай французскай пазыкі задушылі першую рускую рэволюцыю, Горкі закляйміў пагардай Францыю банкіраў—гэту «гандлярку на сусветным рынку», пазычаўшую грошы для расстрэлу рабочых... «Тваім золатам пральецца зноў кроў рускага народа... Прымі... мой плявок крыві і жоўці ў вочы твае!». «Усе лепшыя дзеці твае—не з табой»,—пісаў Горкі, успамінаючы бітвы 1789 года, успамінаючы Вольтэра, Гюго.

Гэты напоўнены гневу і сарказма памфлет быў сустрэт шалёным выццём буржуазнага друку. Рэакцыйныя палітычныя дзеячы, журнальныя пісакі наперарыў нападалі і паклёпнічалі на Горкага. Ён адбіў напад, высмеяў паклёп, адказваючы:

«Вы памыляецеся, відаць мяркуючы, што я кінуў мой дакор у твар усёй Францыі. Для чаго лічаць мяне наіўным? Я ведаю, што народ ніколі не адказен за палітыку камандуючых класаў і ўрада, па-



слухмянага лакея іх... Народ абманваюць і ганьбяць кіраўнікі яго жыцця—ім мае пракляцці, хто-б яны ні былі—немцы, англічане, французы, каралі, банкіры, журналісты».

У сазнанні пролетарскага пісьменніка мысль аб адзінстве інтарэсаў працы неадлучна ад разумення таго, што ў ворагаў працоўных адно нутро—капітал, насілле, паразітызм. Іменна таму раз'юшаная страсцю да нажывы, багатыя вядуць вайну «не толькі для ўмацавання ўлады над беднымі, але і супроць адзін аднаго, сіламі бедных пры дапамозе разумных, г. зн. пры дапамозе той інтэлігенцыі, якая служыць бесчалавечным мэтам капітала». Так пісаў Горкі, паясняючы злачынную «механіку» імперыялістычных войн.

У сваіх расказах і раманах Горкі нарысаваў жывых носьбітаў ідэй пролетарскага інтэрнацыяналізма.

Памятны расказ аб сустрэчы генуэзскімі рабочымі дзяцей забаставаўшых у Парме таварышаў. Няхай жыве маладая Парма!—грыміць натоўп, сустракаючы маленькіх субратоў па класу. «Амаль усе дзеці расхватаны па руках». Адзін з рабочых гаворыць: «Разумееш—калі гэта прыўецца... Нас цяжка будзе адолець...»

Незабыўны раздзелы «Мацеры», якія расказваюць аб тым, як рускія рабочыя ў цяжкіх умовах падполля кавалі адзінства пролетарыяў усіх краін. Горкі рысуе сход гуртка за чытаннем газет аб рабочым народзе за граніцай. «Малайчыны таварышы—немцы!—крычаў хто-небудзь... Няхай жывуць рабочыя Італіі!—крычалі ў другі раз...» і тлумачылі мацеры надзеі і мыслі сабраўшыхся: «Усе рабочыя нашы таварышы, усе багатыя, усе ўрады—нашы ворагі... Мы ўсе—дзеці адной мацеры—непераможнай мыслі аб брацтве рабочага народа ўсіх краін зямлі».

Ён быў суровы, расказваючы аб жыцці народа. «Праўда вышэй за літасць»,— гаварыў ён, разумеючы тую праўду, якая, асвятляючы ўсё навокал ясным святлом, вядзе ўсё наперад. Бяссстрашна следуючы ёй, углядаючыся «у глыбіню Расіі», паказваў пісьменнік пекла народнага жыцця, яго «страсці-мардасці». Але ён-жа паказаў, што ў палоне нішчаты, бяспраўя, невуцтва, уласніцкіх прагненняў выраставалі людзі, якія ўсёй сваёй істотай і свядомымі сацыяльнымі патрабаваннямі і ўсёй сваёй чалавечай асобай адмаўлялі ўмовы, заняволіўшыя іх.

Горкі расказаў аб «непакойных людзях» народнай масы, аб тых, хто шукаў у цмяным хаосе працоўных будняў свайго шляху, азаронага ўсведамленнем мэты і сэнсу жыцця.

Горкі стварыў бессмяротны вобраз рускай жанчыны—бабулькі сваёй Акуліны Іванаўны і расказаў аб сабе—аб хлопчыку, юнаку Алёшу Пешкове, які, выпіўшы горкую чашу пакут народа, не зламаўся, не сагнуўся, светлым розумам і гордым сэрцам адкінуў унушэнне свету рабоў і знайшоў свой шлях барацьбіта за комунізм.

Радасная і мужная песня, з якой прышоў Горкі—буравеснік рэволюцыі—у літаратуру, гучыць ва ўсёй яго творчасці. Гэта ўпэўненасць у перамозе, у спалучэнні з праўдай, якая «вышэй за літасць», —карэнная рыса сацыялістычнай літаратуры.

Калі ахапіць літаратурную, публіцыстычную, грамадскую дзейнасць Горкага ў яе вышэйшых праяўленнях, то будуць усе падставы сказаць: самы рускі па адлюстраванню ў сваёй творчасці народнай Расіі, сапраўды народны пісьменнік, глыбока любіўшы сваю радзіму і аддаўшы ёй усе свае сілы, быў той-жа час палкім прапагандыстам ідэй пролетарскага інтэрнацыяналізма.

Яго вялікі настаўнік і друг Ленін пісаў яму: «Сваім талентам мастака Вы прынеслі рабочаму руху Расіі—ды і не адной Расіі—такую велізарную карысць...» Ленін паўтарыў гэту высокую ацэнку: «Таварыш Горкі надта моцна звязаў сябе сваімі вялікімі мастацкімі творамі з рабочым рухам Расіі і ўсяго свету...» (Ленін, том XIV, стар. 189, 211).

У дзейнасць пісьменніка, моцна звязаўшага сябе з рускім і міжнародным рабочым рухам, нязменна ўваходзіла барацьба супроць імперыялістычнай вайны.

У публіцыстыцы совецкай эпохі Горкі не адыходзіць ад гэтай тэмы. Ледзь не ў кожным сваім артыкуле ён гаворыць аб пагрозе новай крывавай бойні і змагаецца супроць яе, узброены тымі ведамі, той сілай, якія дае Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя і будаўніцтва соцыялізма ў нашай краіне.

Вельмі пераканаўча раз'ясняў пісьменнік прычыны імперыялістычнай вайны, называў яе віноўнікаў і арганізатараў—каралёў капітала.

Горкі выкрываў бяссільную хлусню пацыфістаў і здрадніцтва «соцыял-іезуітаў». «Соцыял-іезуіты... правадыры II інтэрнацыяналла... супроць класавай вайны. Для іх куды больш безапасны крывавыя нацыянальныя бітвы пролетарыяў, справацыраваных капіталістамі».

На пытанне—«Што можна зрабіць, каб унікнуць вайны?»—пісьменнік адказваў: «Тое-ж самае, што зроблена ў Саюзе Советаў».

...Чатыры годы назад, развітваючыся з Алексеем Максімавічам, таварыш Молатаў у сваёй прамове на Краснай плошчы сказаў:

«Горкі... з'яўляецца сапраўдным роданачальнікам пролетарскай, соцыялістычнай літаратуры ў нашай краіне і ў вачах працоўных усяго свету...

Горкі—геніяльны мастак слова.. Горкі—вялікі сын вялікага народа... беззаветны друг працоўных і натхніцель барацьбы за комунізм».

М. ЮНОВІЧ.

М. ГОРЬКИЙ

Сказки об Италии

IX

... Прославим в мире женщину—Мать, единую силу, пред которой покорно склоняется Смерть! Здесь будет сказана правда о Матери, о том, как преклонился пред нею слуга и раб Смерти, железный Тамерлан [1]), кровавый бич земли.

Вот как это было: пировал Тимурбек в прекрасной долине Канигула, покрытой облаками роз и жасмина, в долине, которую поэты Самарканда назвали «Любовь цветов» и откуда видны голубые минареты великого города, голубые купола мечетей.

Пятнадцать тысяч круглых палаток раскинуто в долине широким веером, все они—как тюльпаны, и над каждой—сотни шелковых флагов трепещут, как живые цветы.

А в средине их палатка Гургана-Тимура—как царица среди своих подруг.

... Лицо Хромого—как широкий нож, покрытый ржавчиной от крови, в которую он погружался тысячи раз; его глаза узки, но они видят все, и блеск их подобен холодному блеску царамута любимого камня арабов, который неверные зовут изумрудом и который убивает падучую болезнь. А в ушах царя—серьги из рубинов Цейлона, из камней цвета губ красивой девушки.

... И вот, в час веселья, разгула гордых воспоминаний о битвах и победах, в шуме музыки и народных игр пред палаткой царя, где прыгали бесчисленные пестрые шуты, боролись силачи, изгибались канатные плясуны, заставляя думать, что в их телах нет костей, состязаясь в ловкости убивать, фехтовали воины, и шло представление со слонами, которых окрасили в красный и зеленый цвета, сделав этим одних—ужасными и смешными — других, в этот час радости людей Тимура, пьяных от страха пред ним, от гордости славой его, от усталости побед, и вина, и кумыса—в этот безумный час, вдруг, сквозь шум, как молния сквозь тучу, до ушей победителя Баязета—султана долетел крик женщины, гордый крик орлицы, звук знакомый и ростовенный его оскорбленной душе—оскорбленной Смертью и потому жестокой к людям и жизни.

Он приказал узнать, кто там кричит голосом без радости, и ему сказали, что явилась какая-то женщина, она вся в пыли и лохмотьях, она кажется безумной, говорит по-арабски и требует—она требует!—видеть его, повелителя трех стран света.

— Приведите ее! — сказал царь.

И вот, пред ним женщина—босая, в лоскутках выцветших на солнце одежд, черные волосы ее были распущены, чтобы прикрыть голую грудь, лицо ее как бронза, а глаза — повелительны, и темная рука протянутая Хромому, не дрожала.

— Это ты победил султана Баязета?—спросила она.

— Да, я. Я победил многих и его, и еще не устал от побед. А что ты скажешь о себе, женщина?

— Слушай!—сказала она.— Чтобы ты ни сделал, ты—только человек, а я—Мать! Ты служишь смерти, я—жизни. Ты виноват предо мной, и вот я пришла требовать, чтобы ты искупил свою вину,—мне говорили, что девиз твой—«сила в справедливости», — я не верю этому, но ты должен быть справедлив ко мне, потому что я—Мать!

Царь был достаточно мудр для того, чтобы почувствовать за дерзостью слов силу их,—он сказал:

— Сядь и говори, я хочу слушать тебя!

Она села—как нашла удобным—в тесный круг царей, на ковер, и вот, что рассказала она:

— Я—из-под Салерно, это далеко, в Италии, ты не знаешь, где! Мой отец — рыбак, мой муж—тоже, он был красив, как счастливый человек—это я поила его счастьем! И еще был у меня сын — самый прекрасный мальчик на земле...

— Как мой Джигангир,—тихо сказал старый воин.

— Самый красивый и умный мальчик—это мой сын! Ему было шесть лет уже, когда к нам на берег явились сарацины-пираты, они убили отца моего, мужа и еще многих, а мальчика похитили, и вот четыре года как я его ищу на земле. Теперь он у тебя, я это знаю, потому что воины Баязета схватили пиратов, а ты—победил Баязета и отнял у него все, ты должен знать, где мой сын, должен отдать мне его!

Все засмеялись, и сказали тогда цари—они всегда считают себя мудрыми:

— Она — безумна! — сказали цари и друзья Тимура, князья и военачальники его, и все смеялись.

Только Кермани [2]) смотрел на женщину серьезно, и с великим удивлением—Тамерлан.

— Она безумна—как Мать!—тихо молвил пьяный поэт Кермани; а царь—враг мира—сказал:

— Женщина! Как же ты пришла из этой страны, неведомой мне, через моря, реки и горы, через леса?

Почему звери и люди—которые часто злее злейших зверей—не тронули тебя, ведь ты шла, даже не имея оружия, единственного друга беззащитных, который не изменяет им, доколе у них есть сила в руках?

Мне надо знать все это, чтобы поверить тебе и чтобы удивление пред тобою не мешало мне понять тебя!

Восславим женщину — Мать, чья любовь не знает преград, чьей грудью вскормлен весь мир! Все прекрасное в человеке—от лучей солнца и от молока Матери,—вот что насыщает нас любовью к жизни.!

---

[1]) Тамерлан (Тимур)—восточный завоеватель и основатель Среднеазиатской империи.
[2]) Кермани—имя придворного поэта Тамерлана.

Сказала она Тимур-ленгу:

— Море я встретила только одно, на нем было много островов и рыбацких лодок, а ведь если ищешь любимое—дует попутный ветер. Реки легко переплыть тому, кто рожден и вырос на берегу моря. Горы? Я не заметила гор.

Пьяный Кермани весело сказал:

— Гора становится долиной, когда любишь!

— Были леса по дороге, да, это—было! Встречались вепри, медведи, рыси и страшные быки, с головой, опущенной к земле, и дважды смотрели на меня барсы, глазами, как твои. Но ведь каждый зверь имеет сердце, я говорила с ними, как с тобой, они верили, что я—Мать, и уходили, вздыхая—им было жалко меня! Разве ты не знаешь, что звери тоже любят детей и умеют бороться за жизнь и свободу их не хуже, чем люди?

— Так, женщина!—сказал Тимур.—И часто—я знаю—они любят сильнее, борются упорнее, чем люди!

— Люди,—продолжала она,—как дитя, ибо каждая Мать—сто раз дитя в душе своей,—люди—это всегда дети своих матерей,—сказала она,—ведь у каждого есть Мать, каждый чей-то сын, даже и тебя, старик—ты знаешь это—родила женщина,—ты можешь отказаться от бога, но от этого не откажешься и ты, старик!

— Так, женщина! — воскликнул Кермани, бесстрашный поэт. — Так, — от сборища быков—телят не будет, без солнца—не цветут цветы, без любви нет счастья, без женщины нет любви, без матери—нет ни поэта, ни героя!

И сказала женщина:

— Отдай мне моего ребенка, потому что я—Мать и люблю его!

...Поклонимся Той, которая неутомимо родит нам великих! Аристотель сын ее, и Фирдуси, и сладкий, как мед, Саади, и Омар Хаям, подобный вину, смешанному с ядом, Искандер и слепой Гомер—это все Ее дети, все они пили Ее молоко и каждого Она ввела в мир за руку, когда они были ростом не выше тюльпана, вся гордость мира—от Матерей!

...Тогда встал этот страшный старик и молча поклонился ей, а веселый поэт Кермани, говорил, как дитя, с большой радостью:

— Что прекрасней песен о цветах и звездах?

Всякий тотчас скажет: песни о любви!

Что прекрасней солнца в ясный полдень мая?

И влюбленный скажет: та, кого люблю!

Ах, прекрасны звезды в небе полуночи—знаю!

И прекрасно солнце в ясный полдень лета—знаю!

Очи моей милой всех цветов прекрасней—знаю!

И ее улыбка ласковее солнца—знаю!

Но еще не спета песня всех прекрасней,

Песня о начале всех начал на свете,

Песнь о сердце мира, о волшебном сердце.

Той, кого мы, люди, Матерью зовем!

Все это—правда; все слова здесь—истина, об этом знают наши матери, спросите их и они скажут:

— Да, все это вечная правда, мы сильнее смерти, мы, которые непрерывно дарим миру мудрецов, поэтов и героев, мы, кто сеет в нем все, чем он славен!

М. Горкі і піонеры „Базы курносых"

Жанчыны — грабары

Лесам, кустарнікам, прабіраемся ўсё бліжэй і бліжэй да Туроцкага меліярацыйнага ўчастка. Тут на дзесяткі гектараў раскінуліся топкія балоты. Паверхня іх пакрыта купінамі.

Здалёк чуваць гоман людзей. Белыя і чырвоныя хусціны мільгацяць сярод груд чорнай тарфяной масы, выкінутай па абодвух баках канала. Вясёлы і задорны смех калгасніц разліваецца па балотных прасторах. Жанчыны-калгасніцы сталі актыўнымі барацьбітамі за асушку непраходных балот.

Знатная калгасніца Паша Курыльчык знімае апошні штых. Бурая балотная вада абмывае яе ногі. Лапата ўсё часцей урэзваецца ў тарфяную масу, якую выкідвае яна на бераг з паўтараметровай глыбіні канала. Пашу ўсе ведаюць не толькі як працавітую калгасніцу, але і як грамадскую работніцу. Не раз была яна членам сельсовета. Няданя Пашу зноў выбралі дэпутатам сельсовета. Дэпутат, актывістка Курыльчык за 10 год прабывання ў калгасе не мела ніколі заўвагі. Дзе-б яна ні працавала: на полі, у ферме, на балоце, усюды—перадавая. І тут яна пераняла метады работы лепшых грабароў і не адстае ад іх.

На асушцы балот Паша працуе з першага дня. Разам з ёй на балота прышлі яе сяброўкі-калгасніцы. Спачатку выконвала яна толькі адну норму, а праз некалькі дзён Курыльчык Паша выкінула 14 кубаметраў тарфяной масы, выканаўшы норму на 200 проц.

Пачынанні калгасніцы калгаса «Чырвоная слабодка» Пашы Курыльчык хутка сталі дастаяннем усіх бліжэйшых калгасаў. На балота вышлі новыя дзесяткі жанчын, якія следуючы прыкладу перадавых, з любоўю аднесліся да адказнай работы па асушцы балот.

Кожны дзень масавых работ на балотных масівах прыносіў ўсё новыя і новыя поспехі. У калгасе «Ударнік» звыш 50 жанчын удзельнічалі ў меліярацыі балот. Жаночыя брыгады правялі канал даўжынёю у 1500 метраў. Калгасніцы Алена Коўшар, Ганна Бараноўская, Алеся і Алена Махвіеня сістэматычна выкідвалі па 16—18 кубаметраў торфмасы. Вытворчым энтузіязмам былі ахоплены дзесяткі і сотні жанчын раёна. Настаўніца Забалоцкай няпоўнай сярэдняй школы Люба Шылоўская з грабарскай лапатай у руках вышла з усімі калгасніцамі на асушку балот. Яна не толькі перавыконвала сваю норму, але і праводзіла вялікую агітацыйную работу сярод калгаснікаў на асушцы балот. Люба Шылоўская за ўзорную работу ўказам Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР узнагароджана граматай Вярхоўнага Совета БССР і грашовай прэміяй.

На адным з участкаў працуе 18-гадовая Надзя Сіротнік з сваім бацькам Іванам. Надзежда Іванаўна не адстае ад свайго бацькі—яна правільна вымае штых за штыхам і паглыбляе калектар. Бацька і дачка—гэта лепшыя грабары ўчастка. Яны штодзённа выкідваюць па 25 кубаметраў торфмасы. За адданую работу па асушцы балот Надзежда Сіротнік узнагароджана пачотнай граматай Вярхоўнага Совета БССР і грашовай прэміяй.

Творчы парыў і энтузіязм жанчын даў вялікія рэзультаты. У калгасе «Сталёвы конь», Туроцкага сельсовета, 4 чэрвеня калгасніцы Екацерына Доўбік, Рэня Рубчэня і Марыя Вішнеўская ўстанавілі рэкорд на асушальніках. Яны выкінулі па 61 кубаметру торфмасы, выканаўшы норму на 600 з лішнім процантаў. У гэты дзень кожная з іх зарабіла па 14 працадзён. Калгасніцы сельгасарцелі «Новы шлях» Ульяна Афанасьеўна Верабей выкінула за змену 43 кубаметры, Жэня Лагун, Юсціна Пісарава—па 30 кубаметраў.

Мы ідзем па зрэзаных на квадраты ўжо асушаных балотах. Тут на многа кілометраў раскінуўся прыгожы, роўны як струна, магістральны канал. Па яго дну павольна бяжыць тлустая балотная вада. Ўсё гэта рэзультат дружнай работы калгаснікаў і калгасніц. Учарашнія яшчэ топкія балоты сёння ператвораны ў пладародныя палі. За 14 дзён у раёне асушана 5842 гектара балот.

М. Сімховіч.

М. Любань.



Пасля сканчэння пасеўнай кампаніі тысячы калгаснікаў прыступілі да асушкі балот. Разам са сваімі мужамі і братамі на копцы Юркавіцкага канала працуюць іх жонкі і сёстры (Любаньскі раён, Мінскай абласці).

Фота І. Рабіновіча.